КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 35 (211) ◂ 1 кастрычніка ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144




## БАЧУ МЭТУ

Стар. 4

## БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІЯ АДНОСІНЫ МІНУЛІ КРОПКУ НЕЗВАРОТУ

Варыянты развіцця падзей у кантэксце міжнародных адносінаў абмяркоўваюць рэдактар «НЧ» Аляксей Кароль, журналіст Вольга Хвоін і аглядальнік Раман Якаўлеўскі

Стар. 5

## ДА БАР'ЕРУ

50 гадоў таму ў ЗША ўпершыню ў гісторыі адбыліся дэбаты паміж кандыдатамі на пасаду прэзідэнта

Стар. 13

## ШВЕДСКАЯ БЕЛАРУСІСТЫКА

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## УЛАДЗІМІР КАЦОРА

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **ГЕАПАЛІТЫКА**

# ПАЛІТЫЧНЫ ПЛАНЕРЫЗМ

Вольга ХВОІН

**Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз выказаўся наконт немэтазгоднасці праводзіць знешнюю палітыку ў адным кірунку. Тэза пра шматвектарнасць перыядычна гучыць у прамовах беларускага лідэра цягам апошніх гадоў, але сябрамі і партнёрамі папранейшаму з'яўляецца Расія, краіны Блізкага Усходу, Венесуэла. Стасункі з Захадам трымаюцца на ўзроўні асобных праектаў, якія часта носяць гуманітарны характар.**

Нягледзячы на шматвектарнасць у знешняй палітыцы, «мы неяк нахіліліся на адно крыло», сказаў 28 верасня Аляксандр Лукашэнка, ацэньваючы ўзаемаадносіны Беларусі з сусветнай супольнасцю.

«Беларусь пры выбудоўванні знешняй палітыкі зыходзіць з таго, што яе інтарэсы не павінны быць у шкоду суседнім дзяржавам і ўсяму свету. Мы ні з кім ваяваць не будзем. Мы вельмі акуратныя ў дачыненні да сваіх суседзяў і праводзім такую палітыку, каб яна не была ў шкоду ім», — растлумачыў прынцыпы знешнепалітычных стасункаў Лукашэнка.

Расійскі накірунак цягам апошніх двух гадоў з плоскасці палітычнай плаўна перацёк у плоскасць эканамічную. Калі раней гэтыя складнікі дапаўнялі адзін аднаго, то цяпер беларуска-расійская палітыка скацілася да міжасабовых разборак палітычных лідэраў. Беларусь хацела б атрымліваць па завядзёнцы расійскія рэсурсы па максімальна нізкіх цэнах і ў той жа час мінімальна ўлічваць геапалітычныя інтарэсы Расіі. Прыгадаць хаця б тое, што Беларусь так і не прызнала незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, а Расія на гэта спадзявалася. Расійскі вектар апошнім часам трымаецца на палітычных скандалах і эканамічных супярэчнасцях, што быццам і ёсць дэманстрацыяй шматвектарнасці.




Падвысілі расіяне пошліны на нафту — будзем вазіць яе з Венесуэлы. Гэта новаўвядзенне з раздражненнем і скепсісам успрынялі па ўсходні бок мяжы. Урад Беларусі тым часам дачакаўся першых партый нафты з-за акіяну і працягвае шукаць партнёраў у прыморскіх дзяржавах, каб перагружаць нафту з танкераў у нафтаправоды. Цяпер Беларусь праз Вентспілс ажыццяўляе транзіт нафтапрадуктаў, прадукцыі металургічных кампаній і прадпрыемстваў цяжкага машынабудавання. Абмяркоўваюцца і магчымасці нарасціць аб'ёмы транспарціроўкі праз латвійскія парты калійных угнаенняў.

Агулам лацінаамерыканскі напрамак і сябра Аляксандра Лукашэнкі прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес — гэта асобная песня ў міжнародных справах Беларусі. Палітычныя лідэры гэтых краін наведваюць адзін аднаго з сяброўскадзелавымі візітамі, а венесуэльскія справы курыруе паплечнік Лукашэнкі Віктар Шэйман. Апроч сельгастэхнікі, пэтэхналогій, будаўнічых праектаў, Беларусь разлічваецца за заакіянскую нафту і вайсковымі тэхналогіямі. Яшчэ ў сакавіку, выступаючы ў Нацыянальнай асамблеі Венесуэлы, Аляксандр Лукашэнка паабяцаў Уга Чавесу падзяліцца досведам стварэння сістэмнай абароны дзяржавы. Калі простымі словамі, то размова ідзе пра пастаўкі зброі.

Нафта і зброя — вось апора і аснова міжурадавага сяброўства з Беларуссю. У кастрычніку Аляксандр Лукашэнка наведае з афіцыйным візітам Іран — яшчэ адну краіну, з якой Беларусь развівае сваю шматвектарнасць. Чакаецца, што падчас візіту будзе абмяркоўвацца далейшае развіццё супрацоўніцтва ў гандлёвай, машынабудаўнічай, прамысловай і энергетычнай сферах. Таксама падчас візіту будзе здадзенае для прамысловай здабычы нафтавае радовішча «Джафір». Кантракт пра яго развіццё паміж Іранам і Беларуссю быў падпісаны яшчэ ў 2007 годзе. Раней першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка гаварыў, што на першы час плануецца здабываць блізу 1,5 мільярда тон іранскай нафты. Сяброўства з Іранам, праўда, не робіць вялікага гонару Беларусі. Але, як кажуць, рыбак рыбака бачыць здалёк.

Яшчэ адзін сябар з Усходу — кіраўнік Вялікай лівійскай рэвалюцыі Муамар Кадафі. Да яго з афіцыйны візітам прыязджаў міністр абароны Юрый Жадобін, Беларусь і Лівія падпісалі пратакол аб супрацоўніцтве ў галіне абароны, у 2009 годзе за вайсковымі вучэннямі «Захад–2009» у Беларусі назіраў сын Муамара Хаміс Кадафі, які з'яўляецца камандзірам асобнай узмоцненай брыгады лівійскай арміі. Зразумела, што беларуска-лівійскае супрацоўніцтва хіліцца не ў бок нана-тэхналогій.

Што да вектару еўрапейскага, які мусіў бы быць грунтоўным, калі сыходзіць з геаграфічнага размяшчэння Беларусі, то апроч удзелу ў праграме «Усходняе партнёрства» значных дасягненняў няма. Застаюцца візавыя санкцыі для некаторых чыноўнікаў, прыток еўрапейскага капіталу тармозяць складаныя ўмовы вядзення бізнесу, адсутнасць механізму прыватызацыі і не самы лепшы імідж краіны. У жніўні падчас нарады Аляксандр Лукашэнка выказаў незадаволенасць тым, што прыток прамых інвестыцый у 2010 годзе апусціўся ніжэй за ўзровень мінулага года.

Ключавая мэта «Усходняга партнёрства» — набліжэнне шасці постсавецкіх краін да Еўрапейскага саюза. Беларусь за паўтары гады не пасунулася ў гэтым кірунку. Застаюцца дарагія візы, праблемы з прагрэсам дэмакратыі, лабіраваць інтарэсы Беларусі (а не ўраду Беларусі) спрабуюць прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці. Аднак яны выключаныя з унутрыпалітычнага працэсу, і, адпаведна, атрымліваецца збольшага размова міма вушэй беларускага ўраду.

«Саступкі Еўрасаюзу змяніліся спробамі аднавіць палітыку абмоўленасці ў дачыненні да ўраду Лукашэнкі... Але першапачатковая непрынцыповасць і непаслядоўнасць палітыкі ЕС у дачыненні да Беларусі прывяла да дыпламатычнага тупіку. Для выхаду з яго Еўрасаюзу неабходна вызначыцца з мэтамі дыялогу з Беларуссю: калі галоўнай мэтай будзе доўгатэрміновая палітыка ўцягвання, тады такая непаслядоўнасць у дзеяннях малазразумелая; калі гаворка ідзе пра спробу змены палітычнага рэжыму або яго ізаляцыю — то дзеянні Брусэлю з'яўляюцца недастатковымі і неэфектыўнымі», — выказваецца палітолаг Дзяніс Мельянцоў наконт дзейснай палітыкі ЕС у адносінах з Беларуссю.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЦЕБСК. АЛЬТЭРНАТЫВА

У мэтах прафілактыкі росту рэцыдыўнай злачыннасці з ініцыятывы пракуратуры Віцебскай вобласці і УУС Віцебскага аблвыканкама ва ўсіх раёнах была праведзена акцыя «Альтэрнатыва», скіраваная на аказанне дапамогі ў працоўным і побытавым уладкаванні асобам, якія маюць судзімасць.

Як паведамілі ў Генеральнай пракуратуры, мерапрыемства прайшло ў выглядзе адкрытых пасяджэнняў наглядальных камісій пры мясцовых выканкамах з удзелам пракурораў гарадоў і раёнаў, кіраўніцтва тэрытарыяльных аддзелаў унутраных спраў, прадстаўнікоў цэнтраў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва, грамадскіх фарміраванняў, арганізацый і прэсы. На пасяджэннях таксама прысутнічалі 920 асоб, якія маюць судзімасць. Паводле вынікаў акцыі 168 чалавек працаўладкаваныя, 29 аказана дапамога ў бытавым уладкаванні.

### ГЛУША. ФЕСТЫВАЛЬ ПРОМЫСЛАЎ

29 верасня ў гарадскім пасёлку Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці адбыўся першы фестываль народных промыслаў і рамёстваў «Глушанскі хутарок».

Яго арганізатарам выступіў пасялковы савет пры падтрымцы праекта Праграмы развіцця ААН і Еўрасаюза «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». У фестывалі прынялі ўдзел народныя майстры з многіх раёнаў Магілёўскай вобласці.

Пасёлак Глуша добра вядомы ў краіне і за яе межамі дзякуючы творчасці знакамітага беларускага пісьменніка, літаратуразнаўцы і грамадскага дзеяча Алеся Адамовіча. Ён жыў у Глушы з 1928 года. Паводле яго завяшчання, пісьменнік пахаваны на мясцовых могілках. Імя літаратара прысвоена вуліцы, якая вядзе ад пасляваеннага дома Адамовічаў да школы, дзе вучыўся Алесь. У пасёлку захаваўся будынак былой аптэкі, апісанай Адамовічам у яго творах. Там плануецца стварыць музей «Вайна пад стрэхамі», прысвечаны жыццю і творчасці пісьменніка.

У пасёлку дзейнічае буйны спарткомплекс з басейнам і аднаўляецца цэнтр рамёстваў, створаны ў канцы 1980-х гадоў. Цэнтр дзейнічае на базе музея-скансэна з пабудоў канца XIX — пачатку XX стагоддзяў, звезеных з розных раёнаў вобласці. Сярод іх — дамы ганчара, ткачыхі і лесніка, царква, гумно, лазня і вятрак.

Цэнтр аб'ядноўвае народных майстроў з Глушы і навакольных вёсак, у тым ліку спецыялістаў па кераміцы, саломцы, пляценню з лазы, бандарным рамястве, жывапісе і разьбе па дрэве.

### БРАСЛАЎ. ВЯРТАННЕ ІМЁНАЎ

Сябры грамадскай арганізацыі «Культурна-асветніцкі цэнтр імя Язэпа Драздовіча» ставяць за мэту вяртанне Бацькаўшчыне незаслужана забытых імёнаў, таму прысвячаюць ім мастацкія пленэры, выставы ў гарадах Беларусі, артыкулы ў газетах і часопісах. Сёлетні мастацкі пленэр у гонар Эміліі Плятэр, адбыўся на Браслаўшчыне, дзякуючы падтрымцы грамадзянскай кампаніі «Наш дом». Удзел у ім прынялі мастакі Беларусі і Расіі. Пленэр быў шматлюдны і вельмі прадстаўнічы. Побач з вядомымі мэтрамі беларускага мастацтва працавала таленавітая моладзь.

**Паводле БелаПАН**

▸ З НАГОДЫ

## СВЯТА ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКІ

**Вольга ХВОІН**

**Інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org адсвяткавала дзесяцігоддзе ад часу свайго заснавання.**

Святочнае мерапрыемства адбылося ў сталіцы пры падтрымцы Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Бібліятэка з'яўляецца праектам Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку (Польшча). Фінансавую дапамогу ёй аказвае Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Польшча з праграмы «Польская дапамога–2010».

Kamunikat.org узнік у 2000 годзе як прыватная ініцыятыва, і першы час яго рабілі за свае грошы некалькі добраахвотнікаў. З часам бібліятэка не толькі займела вядомасць, давер, але і спонсараў. Цяпер інтэрнэт-бібліятэка з'яўляецца адной з найбольш вядомых беларускіх бібліятэк у сеціве. Стваральнік і каардынатар праекта Kamunikat.org Яраслаў Іванюк расказаў, што сёння на сайце Kamunikat.org можна знайсці блізу 6 тысяч кніг, перыядычных выданняў, mp3-файлаў, якія так ці інакш датычныя да Беларусі і беларусаў.

Старшыня Рады ЗБС «Бацькаўшчына» Ніна Шыдлоўская сказала, што згуртаванне падтрымлівае Kamunikat.org, станоўча ацэньвае працу калектыву інтэрнэт-бібліятэкі і цешыцца, што інтэлектуальны скарб Беларусі захоўваецца і папулярызуецца ў сусвеце.

Таксама праз сайт Kamunikat.org ёсць магчымасць для беларускіх пісьменнікаў, даследчыкаў ствараць персанальныя сайты. Пісьменнік Уладзімір Арлоў, чые творы таксама ёсць у інтэрнэт-бібліятэцы гаворыць, што распаўсюд электронных версій кніг не адбіваецца на чытацкім попыце: «Я раблю невялікі перапынак паміж выхадам кнігі з друкарні і размяшчэннем яе ў інтэрнэце. Падзення продажу накладаў кніг пасля размяшчэння іх у сеціве я не памятаю. Думаю, што цяпер ёсць людзі, якія звыкліся чытаць кнігі ў традыцыйным выглядзе, і тыя, каму няма розніцы, як выглядае кніга».

▸ ВІЗІТ

## ПРАВААБАРОНЦЫ Ў БРУСЕЛІ

**Алена ВАРАЖБЕЙ**

**Кіраўнікі праваабарончага цэнтра «Вясна» і Беларускага Хельсінкскага камітэта з 20 па 22 верасня знаходзіліся з візітам у Бельгіі. У іх адбыліся сустрэчы з прадстаўнікамі Еўрасаюза, падчас якіх абмяркоўвалася сітуацыя ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў.**

Старшыня ПЦ «Вясна» Алесь Бяляцкі, яго намеснік Валянцін Стэфановіч і старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта Алег Гулак сустрэліся з прадстаўніком Вярхоўнага камісара Еўрасаюза па пытаннях правоў чалавека Рыінай Кіонка, прадстаўнікамі нацыянальных дэлегацый у Еўрапарламенце, Еўрапейскай камісіі і МЗС Бельгіі. Беларускія праваабаронцы правялі таксама прэс-канферэнцыю для журналістаў.

Адной з асноўных тэмаў размовы стала незалежнае назіранне кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», якую сумесна праводзяць «Вясна» і БХК. «Падчас гэтых сустрэч закраналіся і іншыя пытанні, датычныя выбараў. А таксама агульная сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі», — паведаміў Валянцін Стэфановіч. Як адзначылі праваабаронцы, малаверагодна, што гэтыя выбары будуць адрозніваца ад папярэдніх у лепшы бок. Яны выказалі занепакоенасць, каб зноў не было рэпрэсіяў падчас выбараў.

«Мы звярнулі ўвагу, што адносна Някляева ўжо распачата крымінальная справа, ён з'яўляецца падазраваным. І нагадалі пра лёс аднаго з кандыдатаў на выбарах 2006 года Казуліна, які атрымаў 5,5 гадоў пазбаўлення волі пасля тых выбараў. Мы заклікалі Еўрасаюз адсочваць сітуацыю, каб не дапусціць распраў над удзельнікамі выбарчай кампаніі, а таксама масавых мерапрыемстваў, якія, магчыма, адбудуцца пасля выбараў», — распавёў Валянцін Стэфановіч.

Ён лічыць, што цікавасць Еўрасаюза да Беларусі не толькі не саслабела, а наадварот узрасла. «З'явіліся адмысловыя чыноўнікі па Беларусі, чаго раней не было», — кажа праваабаронца. Еўрапейскія суразмоўцы зазначылі, што падзеі ў Беларусі, безумоўна, яны будуць адсочваць і рэагаваць на іх.

Зараз у межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» маніторынг здзяйсняюць 80 доўгатэрміновых назіральнікаў. Справаздачы па назіранні дасылаюцца і прадстаўнікам Еўрасаюза і амбасадаў.

Праваабаронцы падкрэсліваюць, што асноўныя праблемы, якія выклікаюць прэтэнзіі, застаюцца ранейшымі — гэта датэрміновае галасаванне, падлік галасоў, правы назіральнікаў. «З якой нагоды сітуацыя будзе лепшая? Зноў падазраю, што назіральнікі шмат чаго не змогуць пабачыць. Мы мусім даць ацэнку ў любым разе. Адсутнасць інфармацыі — таксама інфармацыя. Калі назіральнік не можа адсочваць падлік галасоў, гэта сведчыць пра тое, што дадзеная працэдура застаецца закрытай. Мы з гэтага будзем рабіць адпаведныя высновы», — адзначыў Валянцін Стэфановіч.

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ЯЎРЭІ СВЯТКУЮЦЬ НОВЫ ГОД



**Алена ВАРАЖБЕЙ**

**Новы год (Рош а-Шана) па яўрэйскім летазлічэнні надышоў 8 верасня. Але навагоднія святкаванні ў яўрэяў, як і ў беларусаў, цягнуцца не адзін дзень.**

Цягам месяца прыпадае чарга святаў — Йом Кіпур, Суккот і Сімхат Тора. А фіналам навагодніх урачыстасцяў стане Фестываль яўрэйскіх восеньскіх святаў, які адбудзецца ў Мінску 3 кастрычніка.

Ён стаў ужо традыцыйным і ладзіцца ў Мінскім яўрэйскім супольным доме, упрыгожаны панадворак якога падчас імпрэзы выглядае надзвычай маляўніча. На вуліцы «яўрэйскіх майстроў» праводзяцца майстар-класы, у тым ліку і па навучанні асноўным элементам яўрэйскага танца, адбудзецца сямейная латарэя. У намётах-станцыях можна даведацца пра традыцыі яўрэйскіх святаў, пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні, пабачыць выставу «Мелодыі кахання» ізраільскай мастачкі Малкі Цэнцыпер. А ў музеі — выставу «Культурная спадчына Беларусі: Сінагогі — мінулае і сучаснае».

З канцэртам выступяць музыкі, сярод якіх і кавер-бэнд «Мінскае мора». І ў гэты дзень можна будзе пачуць трубны голас шафара, полага барановвага рога, у які трубяць на Рош а-Шана. Ён абвесціць, што на яўрэйскім календары зараз ужо 5771 год.

А жадаюць адзін аднаму ў гэтыя дні тое ж, што і звычайна з надыходам Новага года. Каб ён быў шчаслівым і прынёс у кожную сям'ю радасць, цяпло і дабрабыт.

Арганізатары фестывалю запрашаюць адзначыць свята ўсіх жадаючых. Гасцей чакаюць 3 кастрычніка ў Мінскім яўрэйскім супольным доме (вул. В. Харужай, 28) а 13-й гадзіне. Уваход для ўсіх вольны.

▸ ТУРНЭ

## ПАСОЛ ЗАВІТАЎ У ГРОДНА

**Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія доктар Крыстаф Вайль наведаў з двухдзённым візітам Гродна, каб азнаёміцца са станам эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж Германіяй і Гродзенскай вобласцю.**

Нагодай для паездкі стаў удзел у Міжнародным інвестыцыйным форуме «Гродна — горад на перакрыжаванні межаў». 29 верасня падчас сустрэч у Гродзенскім аблвыканкаме і ў свабоднай эканамічнай зоне «Гроднаінвест» былі абмяркаваны перспектывы і магчымасці пашырэння супрацоўніцтва Германіі з Гродзенскай вобласцю.

30 верасня Крыстаф Вайль наведаў сярэднюю школу № 28, каб уручыць афіцыйны знак, які сведчыць пра ўдзел у ініцыятыве «Школы — партнёры будучыні».

Сярэдняя школа № 28 у Гродне з'яўляецца адной з 10 школ у Беларусі (і адной з 1500 школ у свеце), якія прымаюць удзел у гэтай ініцыятыве ўрада Федэратыўнай Рэспублікі Германія і ў якіх выкладанню нямецкай мовы як замежнай аказваецца ўзмоцненая падтрымка.

Адбылася таксама сустрэча ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, на якой ішла размова аб супрацоўніцтве ў сферы вышэйшай адукацыі.

Гэта першы візіт новага пасла Германіі ў беларускі рэгіён.

**Паводле інфармацыі Пасольства ФРГ**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВОСЕНЬСКІ ПІЯР

Сяргей САЛАЎЁЎ




**Чым бліжэй да выбараў, тым крэатыўней становіцца піяр патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты. Вось, прыкладам, Уладзімір Някляеў прызнаўся, што ў дзяцінстве забіў ката. Здаецца, што ў гэтым добрага? Нічога. Але Някляеў гэта здолеў павярнуць на сваю карысць.**

Вечарам 28 верасня ў офісе інфармацыйнай кампаніі БелаПАН лідэр грамадзянскай ініцыятывы «Гавары праўду!», прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта паэт Уладзімір Някляеў і кот Барсік падпісалі мемарандум аб паразуменні паміж «родам чалавечым і ўсімі свойскімі і бяздомнымі жывёламі». Апазіцыйны палітык паставіў пад мемарандумам свой подпіс, кот Барсік — прыклаў лапу.

Падпісаўшы дакумент, бакі дамовіліся забыцца на ўсе крыўды, нанесеныя прадстаўнікамі аднаго роду іншаму, і пачаць будаваць адносіны з чыстага аркуша, без папярэдніх умоў і патрабаванняў.

Някляеў узяў на сябе абавязацельствы дамагацца прыняцця закона аб абароне жывёл, прыкласці намаганні ў справе гуманізацыі працэсу адлову бадзяжных жывёл і іх утрымання, спрыяць будаўніцтву ў Беларусі прытулкаў і гатэляў для жывёл, а таксама зрабіць унёсак у паляпшэнне якасці кармоў для жывёл і зніжэнне цэн на гэту прадукцыю.

Кот Барсік, у сваю чаргу, абавязаўся данесці да свойскіх і бяздомных жывёл інфармацыю пра гуманную місію Някляева.

«Незалежна ад таго, чым завершацца гэтыя выбары, усё тое, пад чым я паставіў свой подпіс, застанецца непарушным», — заявіў Някляеў, каментуючы падпісанне мемарандума.

Шкада, што каты і коткі, ды іншыя свойскія жывёлы, не маюць у Беларусі права голасу.

Больш за тое, паэт дагэтуль не пазбаўлены пэўных мараў наконт беларускай палітычнай сітуацыі. Ужо больш за год апазіцыянеры дамаўляюцца-дамаўляюцца, і не могуць дамовіцца наконт адзінага дэмакратычнага кандыдата ў прэзідэнты. Нават Рада інтэлігенцыі кінула гэту марную справу. Аднак лідэр кампаніі «Гавары праўду!» усё ж такі мае пэўныя спадзяванні на гэты конт.

Ён разлічвае дамовіцца з астатнімі дэмакратычнымі прэтэндэнтамі на пасаду прэзідэнта наконт вылучэння адзінага кандыдата.

«Зразумела, што шматквецце з 17 ініцыятыўных груп абляцець. Рэальна, акрамя Лукашэнкі, могуць прадоўжыць удзельнічаць у выбарчай кампаніі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Някляеў, Саннікаў, Раманчук і Кастусёў. Гэта максімум», — сказаў ён.

Някляеў лічыць, што пераможны працэс наконт адзінага кандыдата пачнецца да завяршэння збору подпісаў. «Ужо ў другой палове збору подпісаў будзе відаць, хто ёсць хто. Прычым пачнецца рух насустрач адзін аднаму найперш тых, хто не будзе набіраць неабходную колькасць подпісаў. Каб трымаць марку, захаваць твар, менавіта яны будуць рухацца да аб'яднальнага працэсу, хоць цяпер быццам пра яго і не гавораць», — сказаў ён.

Някляеў адзначыў, што вядзе перамовы «з усімі». «І нельга сказаць, што гэтыя перамовы зусім не прадуктыўныя», — падкрэсліў ён.

«Калі пачнецца рэгістрацыя кандыдатаў, Лукашэнку будзе над чым падумаць, — сказаў Някляеў. — І гэта будзе незалежна ад таго, збяру хто рэальна 100 тысяч подпісаў ці не. Улады папросту могуць уключыць на карысць зручнага ёй канкурэнта прозвішча з тэлефоннай кнігі, і ніхто на гэта ў Цэнтрвыбаркаме не зверне ўвагі».

Паводле меркавання Някляева, нават калі апазіцыя не абярэ адзінага кандыдата, але хоць бы выйдзе на рэальную магчымасць яго вылучэння, у Лукашэнкі будуць звязаныя рукі. «Ён не будзе ведаць, што зробіць такі кандыдат. Рашэнне, якое можа прыняць адзіны кандыдат, можа быць вельмі нечаканым для ўладаў», — мяркуе ён.

Але нас яшчэ чакаюць і іншыя сюрпрызы. 1 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка дасць прэс-канферэнцыю для расійскіх журналістаў, паведаміў кіраўнік прэс-службы прэзідэнта Павел Лёгкі.

Паводле яго слоў, зараз у Мінску знаходзіцца больш за сотню журналістаў з Расіі. «Яны прадстаўляюць выданні каля 60 расійскіх рэгіёнаў, частка з іх прадстаўляе федэральныя расійскія СМІ, яшчэ частка — СМІ Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі», — сказаў Лёгкі.

Паводле інфармацыі кіраўніка прэс-службы, журналісты прыбылі ў Беларусь 28 верасня і ўжо паспелі наведаць авіябазу ў Мачулішчах, азнаёміцца з сельскагаспадарчым прадпрыемствам у Мінскай вобласці, наведаць гістарычныя аб'екты ў Нясвіжы. «Сёння яны наведваюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы ў Мінску. Праграма візіту вельмі насычаная», — адзначыў Лёгкі. Ён паведаміў, што гэта самы масавы «дэсант» расійскіх журналістаў у Беларусь. «За восем гадоў гісторыі прэс-тураў расійскіх журналістаў у нашу краіну такой колькасці расійскіх прадстаўнікоў СМІ у нас не было. Было па 70–80 чалавек, але не 100. Гэта сведчыць пра вялікі інтарэс расійскіх выданняў да нашай краіны», — сказаў Лёгкі.

Так што 1 кастрычніка нас чакае вялікае піяр-шоў з наўпроставай трансляцыяй пытанняў і адказаў наконт Беларусі і Расіі. Нагадаем, што мінулым разам на падобным мерапрыемстве спадар Лукашэнка прызнаўся, што сфальсіфікаваў выбары і што мае намер быць прэзідэнтам да тых часоў, калі не падрасце ягоны самы малодшы сын Коля. Што цікавага мы пачуем ад яго гэтым разам?

А тым часам завяршылася фарміраванне тэрытарыяльных выбарчых камісій на выбарах прэзідэнта Беларусі. Усяго створана 155 тэрытарыяльных камісій, у тым ліку 118 раённых, 24 раённыя ў гарадах, 6 раённых у гарадах абласнога падпарадкавання (Орша, Барысаў, Пінск, Полацк, Наваполацк, Жодзіна), 6 абласных і адна Мінская гарадская.

Паводле звестак ЦВК, усяго для працы ў тэрытарыяльных выбарчых камісіях быў вылучаны 2681 чалавек. Найбольшую колькасць прадстаўнікоў вылучылі ў тэрытарыяльныя камісіі грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі — 1177.

Ужо вядома, што ў склад Мінскай гарадской тэрытарыяльнай камісіі ўключаны тры прадстаўнікі Партыі БНФ — Юрый Хадыка, Юрый Пальчэўскі і Галіна Сямдзянава. Старшыня ГА «Саюз Чарнобыль-Беларусь» Аляксандр Валчанін уключаны ў склад гарадской выбарчай камісіі Жодзіна (Смалявіцкі раён Мінскай вобласці). У той жа час у складзе Гомельскай абласной тэрытарыяльнай выбарчай камісіі, якая ўжо сфарміравана, няма ніводнага прадстаўніка апазіцыі.




## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНДРЭЙ АРАМНАЎ



Барысаўскі штангіст, пераможца Алімпіяды ў Пекіне Андрэй Арамнаў у трэці раз пагарэў на кіраванні машынай у нецвярозым стане. Пакаранне за паўторнае кіраванне ў нецвярозым стане можа пацягнуць за сабой арышт на тэрмін да 6 месяцаў ці 2 гады папраўчых работ. У другім выпадку Арамнаў прапусціць Алімпійскія гульні 2012 года ў Лондане.

Да ўсяго ў яго допінг-пробе пасля чэмпіянату Еўропы знайшлі сляды марыхуаны. Марыхуана забаронена спартовымі органамі толькі ў перыяд спаборніцтваў, таму беларускі штангіст можа пазбегнуць санкцый па гэтай справе. Спартсмен расказаў, што дыскваліфікацыю на паўгода ён атрымаў яшчэ ў чэрвені пасля таго, як быў станоўчы вынік допінг-пробы, узятай пасля красавіцкага чэмпіянату Еўропы, што праходзіў у Мінску. Прычынамі, з-за якіх Арамнаў прапускае сусветнае першынства, што праходзіла ў Турцыі, называліся дрэнная спартовая форма штангіста і яго жаданне перапыніць прафесійную кар'еру. Штангіст катэгарычна адмаўляе тое, што ўжываў марыхуану. «Што там знайшлі?! Нічога сабе, першы раз чую пра гэта! Марыхуану ніколі ў жыцці не спрабаваў, кажу шчыра!» — цытуе спартсмена «Еўрарадыё».

Зараз Андрэй Арамнаў трэніруецца самастойна. Ён пераходзіць у наступную вагавую катэгорыю, бо яго вага набліжаецца да 110 кілаграмаў. Каб набраць аптымальную форму, штангісту спатрэбіцца 2–3 месяцы.

### НАТАЛЛЯ КАЛЯДЗІНА



Міжнародны валютны фонд раскрытыкаваў планы беларускага ўраду павысіць заробкі ў краіне. «Мы не бачым эканамічных падстаў для значнага росту заробкаў. Рост заробкаў мусіць адпавядаць росту прадукцыйнасці працы. Мне не зразумела, чым тлумачыцца такое істотнае павышэнне», — заявіла ў інтэрв'ю «Reuters» прадстаўніца МВФ у Беларусі Наталля Калядзіна.

27 верасня Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, паводле якога прадугледжана ўстанавіць на лістапад-снежань 2010 года мінімальны заробак памерам 400 тысяч рублёў, пагадзінны мінімальны заробак памерам 2360 рублёў. Такім чынам, мінімальная заработная плата павялічыцца на 54,7 працэнта, а пагадзінная мінімальная заработная плата — на 54,2 працэнта. Гэта падвышэнне заробкаў запатрабуе дадаткова каля 7 трыльёнаў беларускіх рублёў і павелічэння дэфіцыту бюджэту да 3 працэнтаў ВУП.

«Падвышэнне заробкаў прывядзе да росту ўнутранага попыту і росту попыту на імпартныя тавары і паслугі. Гэта азначае пашырэнне дэфіцыту бюджэту і змяненне структуры выдаткаў бюджэту. Ураду трэба будзе генераваць даходы, каб фінансаваць дадатковыя выдаткі, а гэта запаволіць зніжэнне падатковай нагрузкі, — патлумачыла прычыны незадаволенасці МВФ Наталля Калядзіна. — У рамках праграмы прадугледжваўся пэўны рост заробкаў і пенсій. Аднак такое значнае падвышэнне, безумоўна, не адпавядае нашым дамоўленасцям».

У лістападзе Беларусь наведае чарговая місія МВФ. Беларускія ўлады са студзеня 2009 года па красавік 2010 года рэалізоўць праграму МВФ stand-by па стабілізацыі плацежнага балансу. У рамках гэтай праграмы МВФ выдаў Беларусі крэдыт на 3,5 мільярды долараў

### ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА



Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка (11-ты нумар сусветнага рэйтынгу) выйшла ў чвэрцьфінал прадстаўнічага турніру ў Токіо. У паядынку 3-га раўнда адзінкавага разраду супраць францужанкі Марыён Бартолі (14-ты нумар сусветнага рэйтынгу) беларуска выйграла першы сэт з лікам 6:2, а затым яе суперніца не змагла працягнуць матч па стане здароўя. Лекары падазраюць у яе вірусную інфекцыю, паведамляе БЕЛТА. Такім чынам, у чвэрцьфінале Вікторыя Азаранка сустрэнецца з амерыканкай Кока Вандэвей.

У чвэрцьфінал таксама прайшлі расійскія тэнісісткі Вера Званарова (4) і Алена Дзяменцьева (10). Астатнія ўдзельніцы гэтай стадыі спаборніцтваў вызначацца пазней.

Турнір з прызавым фондам у два мільёна долараў завершыцца на кортах японскай сталіцы 2 кастрычніка.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# БАЧУ МЭТУ

Сяргей НІКАЛЮК

**Калі ў Беларусі пабудавана «моцная дзяржава», чаму ж тады сусветныя цэны на нафту і газ пагражаюць суверэнітэту і незалежнасці?**






У «Азбуцы паліталогіі» ад 17 верасня гаворка ішла пра бюракратыю. Нагадаю асноўную ідэю: задача бюракратыі — выконваць рашэнні па дасягненні мэтаў, якія акрэсліваюцца палітыкамі. У Беларусі, як вядома, колькасць палітыкаў зведзеная да мінімуму. 16 верасня адзіны палітык (АП) выступіў на з'ездзе ФПБ з дакладам «Наша мэта — стварыць абноўленае аблічча Беларусі». Зразумела, што пасля такога падарунку ў мяне не ўзнікла праблемаў з пошукам тэмы для чарговага артыкула.

Тлумачальны слоўнік падказвае, што пад «аблічччам» варта разумець знешні выгляд, абрысы, знешнасць.

Цікава атрымліваецца. На двары сусветны крызіс, хвалі якога падхапілі Беларусь, ды так грунтоўна, што калі б не крызіс, у нас сёння была б «*совершенно иная страна*», а наш аднаасобны ўладальнік права на вызначэнне мэтаў прапаноўвае ўсім нам перакваліфікавацца ў іміджмэйкераў (стваральнікаў аблічча).

## Пра аглоблю і фантан

Але пяройдзем ад эмоцый да нашай «азбукі паліталогіі». Перад элітай стаяць тры задачы: стварэнне сімвалаў, якія аб'ядноўваюць грамадства, фармаванне нормаў і вызначэнне мэтаў развіцця. Ад таго, як айчынная эліта спраўляецца са сваімі функцыянальнымі абавязкамі, і залежыць у канчатковым выніку ўзровень «*конкурентоспособности в мире не только белорусской продукции, но и всей нашей страны в целом*». Зразумела, без адпаведнага ўзроўню канкурэнтаздольнасці бессэнсоўна нават марыць пра тое, «*чтобы качество жизни людей ни в чем не уступало качеству жизни самых передовых государств нашего мира*».

Супраць такой якасці жыцця, спадзяюся, пярэчыць ніхто не будзе. На шчасце, дзеля яго дасягнення нас чакае не толькі абнаўленне аблічча Беларусі, але і «*модернизация экономического уклада*». Улічваючы, што я апярыраю выключна «азбукавымі» паняццямі, нагадаю, што пад эканамічным укладам разумеецца спосаб гаспадарання, у аснове якога ляжыць пэўны тып уласнасці на сродкі вытворчасці.

У намеры нашага АП мадэрнізаваць нешта ў пытаннях уласнасці мне чамусьці не верыцца. Таму адважуся выказаць здагадку, што пад эканамічным укладам ён разумее тэхналагічны ўклад. Апошніх налічаецца аж шэсць штук. Перадавыя краіны жывуць сёння ў пятым (мікраэлектроніка, інфарматыка і г. д.) і імкнуцца перайсці ў шосты (нанатэхналогіі, штучны інтэлект, малекулярная біялогія).

Беларусь дастаткова ўпэўнена асвоіла чацвёрты ўклад, заснаваны на энергетыцы з выкарыстаннем нафты і газу, на вытворчасці трактароў і тавараў народнага спажывання. Пяць гадоў таму на трэцім Усебеларускім народным сходзе была здзейснена спроба замахнуцца на пяты ўклад: «*Мы не можем сунуть под Минском оглоблю в землю — и оттуда польется фонтан нефти, как в Ираке или в Саудовской Аравии, не можем пробурить скважину в полтора, даже три километра — и хлестанет газ… Только ум, творческая инициатива на основе науки дадут нам возможность выжить, как выживали и выживают, и неплохо сегодня живут многие государства*».

Што мы маем сёння? Мы маем пагрозу незалежнасці з прычыны пераходу Расіі на пастаўку вуглевадародаў па сусветных цэнах. «Беларускай эканамічнай мадэлі» такія цэны супрацьпаказаныя. Яна затрымалася ў чацвёртым укладзе. А гэта азначае, што абавязанне па развіцці розуму і творчай ініцыятывы, прынятае на трэцім Усебеларускім народным сходзе, АП не выканаў.

## У пошуку айчынных стратэгаў

Гістарычны досвед паказвае, што самыя паспяховыя трансфармацыі ажыццяўляліся прадстаўнікамі кіруючага класа, што своечасова ўсвядомілі тупіковасць маршруту, па якім яны ішлі. Урад — далёка не апошняя па статусе частка кіруючага класа. Ці варта шараговым грамадзянам песціць надзею на мадэрнізацыйны патэнцыял урадаўцаў?

> Не чалавек упрыгожвае месца ва ўладнай «вертыкалі», а месца ўпрыгожвае чалавека

Асабіста я ні з кім з іх не знаёмы, таму звярнуся па дапамогу да «Советской Белоруссии»: «Ураду, падкрэсліў Л. Анфімаў (намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта), неабходна думаць стратэгічна. Бачыць далягляд, новае аблічча Беларусі як развітой еўрапейскай дзяржавы. Але эканамічны штаб… заняты тактычнымі пытаннямі: падтрымкай аднаго прадпрыемства, другога, трэцяга… Аднак няўжо можна назваць меры «па падтрыманні на плаву» стратэгічнымі? Дзе ж цэласнае бачанне сучаснасці і будучыні?»

А сапраўды, дзе ж яно? Ва ўрадзе, як мы толькі што пераканаліся, яго няма. Што, дарэчы, здзіўляе, таму што, паводле артыкула 107 Канстытуцыі, урад «распрацоўвае асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі і прымае меры па іх рэалізацыі». Калі спадар Анфімаў мае рацыю (а сумнявацца ў яго кампетэнтнасці няма падстаў), дык беларуская ўнутраная і знешняя палітыка ажыццяўляецца людзьмі без цэласнага бачання не толькі будучыні, але і сучаснасці!

Аднак, магчыма, стратэгі засядаюць у самой Адміністрацыі прэзідэнта? Зноў адкрыем Канстытуцыю. Не, Канстытуцыя думаць стратэгічна чальцоў Адміністрацыі прэзідэнта не абавязвае. Яна іх наогул ні да чаго не абавязвае. У артыкуле 84, у якім пералічаныя функцыі прэзідэнта, сказана, што прэзідэнт «утварае, скасоўвае і рэарганізуе Адміністрацыю». І гэта ўсё!

Не здзіўляйцеся, з пункту гледжання «Азбукі паліталогіі», аўтарытарныя палітычныя рэжымы няўтульна адчуваюць сябе ў прававым асяроддзі. Гэта агульная заканамернасць. У якасці каментара прывяду выказванне польскага сацыёлага Зыгмунта Баўмана: «Панаванне дасягаецца скасаваннем правілаў, якія абмяжоўваюць уласную свабоду выбару, і ўстанаўленнем максімальна магчымай колькасці правіл, якія прадпісваюць нормы паводзін усім іншым. Чым шырэй поле для майго манеўру, тым большая мая ўлада». Спадзяюся, каментаваць гэтыя словы не патрэбна.

## У пошуках балансу

У дакладзе на прафсаюзным з'ездзе прагучала слова «мабілізацыя» («профсоюзы могут и должны мобилизовать трудовые массы на прорыв»). Спынюся на ім больш падрабязна. Савецкае грамадства — класічны ўзор грамадства мабілізацыйнага тыпу. Абвясціўшы лозунг «Найперш думай пра Радзіму, а потым пра сябе», улада сутыкнулася з праблемай спалучэння дзяржаўнага інтарэсу з інтарэсамі прыватнымі.

Што да асноўнай масы насельніцтва, то праблема гэта вырашалася за кошт камбінацыі наўпроставага прымусу і дзяржаўнай ідэалогіі. А вось для мабілізацыі эліты дадаткова спатрэбіўся пернік у выглядзе прывілеяў. Але, стымулюючы эліту прывілеямі, вярхоўная ўлада распальвала яе прыватныя інтарэсы. Так утварылася замкнёнае кола. Вырвацца з яго савецкая ўлада не змагла, і ў выніку прыватныя інтарэсы мясцовых эліт разарвалі «краіну пераможнага сацыялізму» на нацыянальныя ўдзелы. Але праблема ад гэтага не знікла, яна папросту апусцілася з узроўню генеральнага сакратара на ўзровень новаспечаных прэзідэнтаў.

У падтрыманні балансу паміж інтарэсамі АП краін СНД і іх найбліжэйшымі асяродкамі і варта шукаць асноўную крыніцу палітычнай стабільнасці. Атрымліваецца гэта далёка не заўсёды і не ва ўсіх. Але ў Беларусі пакуль атрымліваецца. Прывяду адпаведную цытату: «*Никакой чиновничьей, депутатской, президентской приватизации и семейной тоже не будет! Поэтому если кто-то рассчитывает на то, что вот-вот оно начнется, и мы, сидя у власти, что-то схватим пожирнее, дорогие мои, ничего подобного! Я реагирую на это, зная, что некоторые слухи уже плывут в чиновничьих кабинетах. Забудьте!*»

Пачатак чыноўніцкай прыватызацыі азначаў бы трансфармацыю ПУП «Беларусь» у ЗАТ. Не факт, што ўлада змагла б яе правесці ў кантраляваным рэжыме, але нават і ў выпадку спрыяльнага зыходу кола бенефіцыянтаў абмежавалася б абранымі чыноўнікамі. Тут варта нагадаць пра перавод савецкай эканомікі на гаспадарчы разлік, які можна разглядаць у якасці нясмелага руху ў накірунку прыватызацыі. Яе асноўным вынікам стала нарастанне сацыяльнай няроўнасці, таму што «чырвоныя дырэктары» хутка сцямілі: прадстаўленая гасразлікам свабода дазваляе прыватызаваць фінансы даручаных ім прадпрыемстваў.

## Асабістае — гэта нават не другаснае

Спробы «*мобилизовать трудовые массы на прорыв*» не варта ўспрымаць сур'ёзна. На гэта ў АП папросту няма рэсурсаў. Максімум, на што ён можа разлічваць, — мабілізаваць уладную «вертыкаль». Уласна кажучы, «вертыкаль» стрымліваецца ад падзення выключна за кошт яго мабілізацыйных высілкаў. Але, мабілізуючы «вертыкаль» на выкананне абавязкаў, узятых на трэцім Усебеларускім народным сходзе, АП вымушаны адначасова займацца яе палітычнай дэмабілізацыяй. Інакш статус АП апынецца пад пагрозай.

У якасці прыкладу палітычнай дэмабілізацыі прывяду нядаўняе выказванне на адрас прэм'ер-міністра: «*Я политик, я должен думать о людях, а вы должны думать об экономике и финансах. У вас людей нет*».

Гэта ж тэма не засталася ўбаку і падчас нядаўняга выступу перад студэнтамі Акадэміі кіравання. АП растлумачыў будучым чыноўнікам, што менавіта «служэнне» з'яўляецца ключавым словам у паняцці дзяржаўнай службы. Дзяржаўны чыноўнік, службовец — «*это особый человек, который должен понимать, что он в какой-то степени принесен в жертву, и его личное — это даже не второстепенный, а третьестепенный вопрос*». Лепшай ілюстрацыі паняцця «беззаветное служение», мабыць, і не знайсці (падрабязней пра «*беззаветное служение*» гл. «Кастрыраваная сацыялогія»).

Нагадаю, запавет — гэта кантракт, які прадугледжвае ўзаемныя правы і абавязкі бакоў, што дамаўляюцца. У гэтым сэнсе беларуская кантрактная сістэма асіметрычная: у тых, хто зверху, — правы, у тых, хто знізу — абавязкі, а прыватнае ў падпарадкаваных — «*это даже не второстепенный, а третьестепенный вопрос*». І так ад асновы ўладнай «вертыкалі» да яе вяршыні. Адзінае выключэнне — сам АП.

Узровень кадраў, падабраных па прынцыпе «*беззаветного служения*», бачны на прыкладзе эксміністра У. Навумава. На просьбу даць інтэрв'ю пасля адстаўкі ён адказаў літаральна наступнае: «Вялікага сэнсу ў інтэрв'ю не бачу — бо я ўжо ніхто». Гэта значыць, не чалавек упрыгожвае месца ва ўладнай «вертыкалі», а месца ўпрыгожвае чалавека. Самі ж па сабе чальцы «вертыкалі» ў лепшым выпадку «ніхто». Якія ж пасля гэтага шанцы Беларусі перайсці з чацвёртага тэхналагічнага ўкладу ў пяты?

АНАЛІЗ

# БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІЯ АДНОСІНЫ МІНУЛІ КРОПКУ НЕЗВАРОТУ

**Беларусь блізкая да палітычнага пералому. З гэтымі выбарамі, ці, дакладней, поствыбарчым перыядам звязваюць спадзяванні на перамены ў кіраўніцтве краіны. Як ніколі многа размоў пра тое, што Расія гатовая не толькі падтрымаць змену палітычных эліт у Беларусі, але і надаць гэтым працэсам паскарэнне. Варыянты развіцця падзей у кантэксце міжнародных адносінаў абмяркоўваюць рэдактар «НЧ» Аляксей Кароль, журналіст Вольга Хвоін і аглядальнік Раман Якаўлеўскі.**



www.nn.by

Раман Якаўлеўскі

***— Тон Аляксандра Лукашэнкі ў дыялогу з усходняй суседкай кардынальна змяніўся ў прымірэнчы бок. Ці не значыць гэта, што ёсць дамова наконт прызнання Расіяй беларускіх выбараў?***

— Немагчымы ўжо гандаль па прынцыпу дай за дай. Масква стымулюе апазіцыйныя настроі ў наменклатуры, дый сама краіна цяжарная пераменамі. Я не адмаўляю варыянту пайсці па новым, больш дэмакратычным шляху, як і варыянту сыходу ў поўную ізаляцыю. Гіпатэтычны палітык, які прыйдзе на змену Лукашэнку, будзе вымушаны разрульваць тыя праблемы, што накапіліся за гэты час. У тым ліку і з заходнімі крэдытамі. І чым больш мы патанаем у гэтай багне, тым больш зваліцца на галаву наступніку. Але з іншым кандыдатам магчымае змякчэнне, паніжэнне ціску. Паглядзіце, як змянілася палітыка Расіі ў адносінах да Украіны пасля змены ўлады. Аляксандр Лукашэнка ўсё больш уцягвае краіну ў гэту яму пазыкаў. Але, калі не памылюся, Польшчы Еўрасаюз спісаў пяць мільярдаў долараў пазыкаў. І сёння Польшча ці не адзіная краіна ў Еўропе, якая з крызісу выйшла з плюсам. Прычыны ў тым ліку і ў рэфармаванай эканоміцы. Нават Латвія выкараскалася. Былі датацыі Еўрасаюза, але гэта ЕС, а не іранскія, венесуэльскія крэдыты, пра сутнасць якіх мы нічога не ведаем.

***— Аляксандр Лукашэнка можа быць абраны ў снежні на чарговае старшынства ў Арганізацыі дамовы аб калектыўнай бяспецы. Ён жа гаварыў, што гэта арганізацыя мусіць трымацца інтарэсаў дзейных рэжымаў у крытычных сітуацыях. Калі пасля выбараў будуць пратэстныя настроі, ці можна чакаць уводу войскаў АДКБ у Беларусь?***

— На апошнім нефармальным саміце АДКБ зноў падымалася тэма магчымага ўмяшання ва ўнутрыпалітычныя падзеі. Гэта дазваляецца, калі ёсць знешняя пагроза дзейснаму палітычнаму рэжыму. У Кыргызстане такой пагрозы не знайшлі. Цяпер плануецца пашырыць функцыі АДКБ да паліцэйскіх. Калі ў Беларусь прыязджаў генеральны сакратар АДКБ, Лукашэнка з'ехаў у Брэсцкую вобласць з працоўным візітам. Але, калі з'явіўся Бардзюжа, Аляксандр Рыгоравіч з ім сустрэўся, і абмяркоўваліся пытанні наступнага саміту ў Маскве. Пасля гэтай сустрэчы была прызначаная дата выбараў, думаю, гэта ўзаемазвязана. Я не вельмі ўяўляю, як беларускі лідэр будзе сядзець за адным сталом з фактычна непрызнанай ім Розай Атунбаевай. І тым больш не разумею, як ён будзе каардынаваць працу іншых прэзідэнтаў, у тым ліку Дзмітрыя Мядзведзева. АДКБ дзейнічае ў трох вымярэннях — армянскім, беларускім і цэнтральна-азіяцкім. Што беларусам рабіць у Цэнтральнай Азіі ці казахскаму спецназу ў Беларусі? У АДКБ у гэтых трох вымярэннях пануе Расія. А арганізацыя больш ёсць інструментам для куплі-продажу зброі па льготных коштах.

***— Расія і Захад: пазіцыі ў адносінах да Беларусі сышліся. Расія зацікаўленая ў змене, Захад — у дэмакратызацыі. Гэта ўпершыню, калі па абодва бакі хацелі б бачыць перамену ўлады ў Беларусі.***

— Захад і Расію аб'ядноўвае не столькі Беларусь, колькі кітайская пагроза. І калі Лукашэнка гаворыць, што Беларусь гатовая стаць кітайскім плацдармам у Еўропе, гэта значна больш эфектыўна перасцерагае брусельскіх камісараў, чым гіпатэтычныя дэмакратыя, празрыстыя выбары. А тут яшчэ і рэальная палітыка — як бы гандляваць без непрыемнасцяў. На жаль, такая пазіцыя ёсць у Захаду. Калі мы чуем пра 15 мільярдаў долараў кітайскіх звязаных крэдытаў, то трэба памятаць, што гэта стварае рэальную пагрозу наплыву кітайцаў. Я не расіст, але насамрэч ёсць небяспека з'яўлення меншасці, што стане ўплывовай, — гэта кітайцы, якія не інтэгруюцца ў чужую культуру. Тым больш, мы маем вялікія праблема з тытульнай нацыяй.

***— Колькі можа аўтарытарны палітык супрацоўлiчацца знешняму ціску?***

— Лукашэнка — нерэфармуемы персанаж, і ён будзе супраціўляцца да апошняй хвіліны. Румынскі варыянт не пажаданы, але я б яго не выключаў. У Румыніі ўсё адбылося імгненна, ніхто дагэтуль не ведае, якія снайперы сядзелі там на дахах і як выкарыстоўваліся шахцёры. Нагадаю, што Чаўшэску паспяхова праводзіў палітыку нацыянальнага эгаізму. Быў аўтарытарызм, крадзіць, нафта. Вельмі падобна на паводзіны Лукашэнкі цяпер. Ён будзе да канца, нейкага варыянту свабодных выбараў не будзе, не чакае нас міралюбівая перадача ўлады ад дыктатара выбарнаму органу.

***— Аўтарытарны рэжым абапіраецца на знешні і ўнутраны рэсурс. Беларусь губляе знешні. Застаецца толькі сацыяльны — цярпенне людзей. Калі ўзнікае пагроза ўладзе, рэалізуецца сацыяльны кантракт.***

— Масы ніколі не былі творцамі гісторыі. Таму іх можна паступова даводзіць да ўзроўню галечы. У Паўночнай Карэі налічваецца каля мільёна чыноўнікаў, якія зацікаўленыя ў рэжыме. Падобны клас патрыцыяў сфарміраваўся і ў нас. Калі кажуць, што нашым чыноўнікам хочацца на Захад, то ўзнікае пытанне: навошта ім гэта? Іх задавальняе дзейсная сістэма, правілы гульні зразумелыя. Хаця яны і жорсткія: як толькі нешта не так, адразу выцягваецца кампрамат. І мы не ведаем сапраўдны маштаб гэтых разборак. Для мяне вялікая загадка, чаму столькі ўплывовых чыноўнікаў атрымалі дазвол збегчы ў Маскву. Звярніце ўвагу, якія пасады яны там займаюць: былы шэф КДБ Уладзімір Мацкевіч — дарадца генеральнага дырэктара буйнейшай расійскай кампаніі «Совкомфлот», былы шэф КДБ Леанід Ерын — дарадца кіраўніка Расійскіх чыгунак, якія ачольвае генерал ФСБ Якаўлеў. Экс-міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў цяпер працуе дарадцам кіраўніка дзяржкарпарацыі «Ростехнологии», якую ўзначальвае генерал ФСБ Чэмезаў. У Расіі пііцерская брыгада генералаў-чэкістаў пасля Ельцына здзейсніла пераразмеркаванне і трымае эканоміку. Былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Урал Латыпаў жыве і працуе ў Маскве. У старажытным Рыме, каб валадарыць, трэба было валодаць дарогамі. Цяпер трэба валодаць інфармацыяй. Гэтых людзей адпусцілі ў Расію, і цяжка нават уявіць, што яны ведаюць.

***— Лукашэнка не мог іх не адпусціць. Не тыя часы і не тая магутнасць...***

— У мяне няма на гэта адназначнага адказу. Я чакаю з'яўлення Уладзіміра Мацкевіча. Ведаю, што ён двойчы спрабаваў правіцца на прыём да кіраўніцтва Расіі, але не пусцілі. У Расіі ідзе сістэмны падыход да беларускага пытання, і кропка незвароту пройдзеная. У Расіі хутка будуць выбары, я не выключаю, што могуць быць агучаныя кампраматныя звесткі аб бізнес-інтарэсах апальнага Лужкова і Лукашэнкі. Дапускаю, што можа ўсплыць нешта пра сувязі з Барысам Беразоўскім. Бясконца спектакль «Беларусь — Расія» не можа цягнуцца.

***— Гавораць пра варыянт пераемніка, унутранага, паступовага абмежавання Аляксандра Лукашэнкі ва ўладзе і перадачы яе.***

— Гэта абстрактныя канструкцыі, і ствараць іх мае права любы мазгавед. Што тычыцца старэйшага сына, Віктара Лукашэнкі, то, мяркую, гэта калектыўны псеўданім. Рэальна ён уладай, уплывам, аўтарытэтам не карыстаецца. Гэта выгодная нейкай групе асобаў увасабленне жорсткай лініі і легенды пра пераемніка. Нас пагружаюць у гэтыя разважанні, малодшага ўзгадваюць, але Аляксандра Лукашэнку гэта толькі забаўляе. Думаю, што кіраўнік Беларусі ў рэжыме ручнога кіравання кантралюе дзейнасць сілавікоў. Гэтыя размовы пра пераемніка, пра рост уплыву памочніка па нацыянальнай бяспецы ў мяне выклікаюць асацыяцыі з казачным персанажам Карабасам Барабасам, калі астатнія ўсяго толькі персанажы лялечнага тэатра. Бойкі паміж сілавікамі ёсць заўсёды, тым больш ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму, пры адсутнасці парламенцкага, грамадзянскага кантролю. Лукашэнка ўсяго толькі адных падымае, іншых прытармажвае, а спецыфіка падобных рэжымаў у тым, што сілавыя структуры пасуць і сегменты эканомікі.

***— Якіх наступстваў у адносінах з Расіяй можа чакаць наша дзяржава пасля змены ўлады? Ці не пагражае нам новы варыянт Паўночна-Заходняга краю?***

— Будзе пераходны перыяд да свабодных выбараў. Так, можа з'явіцца больш прадказальны кіраўнік. Я веру ў светлую будучыню Беларусі, але хацелася б, каб гэта адбылося пры нашым жыцці. Расія наўрад ці пойдзе на варыянт калоніі, тым больш, ёсць новае пакаленне беларусаў, што не ўспрымуць такога павароту. У цяперашніх умовах малаверагодны варыянт таго, што Беларусь перастане быць суб'ектам міжнароднага права. Страхі нацыянал-дэмакратаў у большасці надуманыя. Хутка ў Беларусі будзе новы польскі пасол, які не з'яўляецца прафесійным дыпламатам. А адносіны Захаду да нашых унутраных, знешнепалітычных падзей моцна залежаць ад таго, пад якім ракурсам падаецца інфармацыя.



**Вялікая загадка, чаму столькі ўплывовых чыноўнікаў атрымалі дазвол збегчы ў Маскву. Звярніце ўвагу, якія пасады яны там займаюць**

ВЫБАРЫ–2010

# УМЕРАНА АКТЫЎНАЯ КАМПАНІЯ

Вольга ХВОІН

**Кампанія па выбарах прэзідэнта Беларусі багатая на патэнцыйных кандыдатаў. Прэзідэнт, паэт, пенсіянер... Санітаркі хіба што не далічыліся. Нездарма ў Цэнтрвыбаркаме казалі пра «вясёлыя» выбары.**

Прэтэндаваць на атрыманне пасведчання кандыдата ў прэзідэнты і адпаведны запіс у працоўную кнігу будуць 17 чалавек. У гэтым доўгім спісе ёсць прадстаўнікі апазіцыі — усім вядомыя Рыгор Кастусёў, Алесь Міхалевіч, Віталь Рымашэўскі, Яраслаў Раманчук, Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч, Уладзімір Някляеў. А таксама яшчэ мала каму вядомы кандыдат ад Беларускай партыі «Зялёныя» Юрый Глушакоў.

«Тактычна гэта інфармацыйная раскрутка партыі, развіццё яе структур, рэклама. Што тут дрэннага? Частка беларускага грамадства, якая палітызаваная, — гэта 1–2 працэнты, ну 5. Як пачнецца кампанія, то палітызаванымі будуць 20–30 працэнтаў. І яны будуць рабіць выбар на карысць таго ці іншага кандыдата. Думаю, што для беларускага абывацеля прозвішча Глушакоў гэтак жа нічога не значыць, як Міхалевіч, Кастусёў. На этапе палітызацыі выбарцы будуць атрымліваць інфармацыю, і не выключаю, што Юрый Глушакоў стане больш авангарднай фігурай», — дзеліцца спадзевамі лідэр беларускіх зялёных Алег Новікаў.

Натуральна, выбары не атрымаецца правесці без старшыні ЛДП Сяргея Гайдукевіча і дзейнага кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

Таксама ў кампанію ўвязаліся пенсіянер Пётр Барысаў, беспрацоўны і былы сілавік Сяргей Іваноў, старшыня савета Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Віктар Цярэшчанка, індывідуальны прадпрымальнік з Віцебска Уладзімір Правальскі, начальнік сектара знешнеэканамічнай дзейнасці ААТ «Віцебскі плодаагародніны камбінат» Сяргей Рыжоў, загадчык лабараторыі абсталявання ядзерных энергетычных установак Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Іван Кулікоў і дырэктар ТДА «Трывіум», зорка мікрараёна Курасоўшчына ў сталіцы Дзмітрый Ус.



Канешне, пасля збору подпісаў гэты спіс будзе падкарочаны — усё ж 100 тысяч галасоў у сваю падтрымку сабраць не так проста, як дакументы ў ЦВК занесці. Хутчэй за ўсё, да рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты падыдуць цяперашні кіраўнік Беларусі, абавязковы чалавек Сяргей Гайдукевіч, парачка прадстаўнікоў апазіцыі. Хаця кандыдаты ад апазіцыі, як па змове, заяўляюць, што намеры ў кожнага сур'ёзныя — перамога над Аляксандрам Лукашэнкам — і запэўніваюць, што здымацца на карысць таго ці іншага кандыдата не плануюць.

Такі расклад спрыяльны акурат для першага і пакуль адзінага прэзідэнта незалежнай Беларусі — галасы выбарцаў размыюцца, а стабільны электарат Лукашэнкі застанецца з ім, бо каней на пераправе не мяняюць. А насамрэч яркі і актыўны кандыдат можа ці не пераадолець парог рэгістрацыі, ці паўтарыць шляхі палітыкаў у месцы не надта далёкія. Апазіцыі часта закідваюць: «Няма ў вас ідэй яркіх, добрых. Няма за кім ісці». Але ці не ёсць так, што беларускаму грамадству гэтыя ідэі да лямпачкі. Пакуль смажаны певень не клюне... Чарка ёсць, шкварку не забралі, а новыя амбіцыі не саспелі.

У хуткім часе прэтэндэнты ў кандыдаты на пасаду прэзідэнта будуць рыхтаваць дэкларацыі аб даходах сваіх сямей. Цэнтрвыбаркам нават дазволіць рэгістраваць кандыдатаў, якія пададуць дэкларацыі з памылкай даходу, што не перавышае 20 працэнтаў ад сярэднегадавога прыбытку кандыдата. Кветкі лібералізму. Больш таго, ЦВК нават у кампаніі збору подпісаў пойдзе насустрач.

Збор подпісаў завершыцца 29 кастрычніка. Кіраўніца ЦВК Лідзія Ярмошына запэўніла, што для гэтага працэсу «ствараюцца максімальна зручныя ўмовы». Напрыклад, раней выканкамы забаранялі ставіць пікеты па зборы подпісаў у падземных пешаходных пераходах, то цяпер абмежаванне будзе скасавана «з улікам дажджлівага надвор'я». Але застаецца забарона на збор подпісаў каля будынкаў судоў, пракуратуры, вакзалаў, базараў, гандлёвых цэнтраў. Нельга будзе збіраць подпісы на адлегласці бліжэй як 200 метраў ад Адміністрацыі прэзідэнта і 50 метраў ад будынкаў, дзе размяшчаюцца іншыя органы ўлады.

«Паслявыбарная сітуацыя бывае рознай. Калі мы згадаем «аранжавую рэвалюцыю» ва Украіне, то там не было такіх яўных парушэнняў, каб можна было гаварыць пра фальсіфікацыю. Але народ выйшаў на плошчу — і правялі трэці тур выбараў. Я нічога апроч таго, што напісана ў законе, не скажу. Прычынай могуць быць парушэнні, якія ўплываюць на вынікі выбараў», — так выглядае варыянт выбарчага павароту ў інтэрпрэтацыі спадарыні Ярмошынай.

РАЗВАЖАННІ

# УСЕБЕЛАРУСКІЯ ДРАЗДЫ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Сёння ніхто не называе Беларусь дэмакратычнай краінай. Хіба што афіцыйныя ідэолагі, якія лічаць Усебеларускі сход самым яскравым вынікам глыбокай дэмакратызацыі грамадства. У савецкія часы гэта называлася «подлинным народовластием».**

Значыць, усё астатняе, у лепшым выпадку, — лухта. Можна было б не звяртаць нават увагі, але Усебеларускі сход здольны даць вельмі своеасаблівае этычнае апраўданне «подлинного народовластия» — паўнавартасную легітымізацыю праведзеных без шматлікіх заўважаных назіральнікамі і прэсай парушэнняў выбараў.

Як напісаў адзін палітычны аглядальнік, старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына, чые перадвыбарныя прагнозы звычайна пацвярджаліся, чакае на выбарах 4–5 кандыдатаў. Смех дый годзе! Прагноз — гэта метад выяўлення тэндэнцыі, заснаваны на аналізе верагодных сітуацый. Калі, прыкладам, фурман добра трымае лейцы ў руках, калі конь зацугляны, калі падджарка таму пад зад пры спуску не б'е, то цалкам верагодна, што воз з'едзе з крутой гары цэлым. Насамрэч, і тут ёсць элемент нечаканасці. Раптам нейкі дурань знянацку ў каня над вухам стрэліць — той панясе, што ніякія цуглі не ўтрымаюць. Такое рэдка, але здараецца.

Калі б, прыкладам, Ярмошына абвясціла, што на гэтых выбарах пойдзе ўпартая барацьба канкурэнтаў з «единственным» (не путаць з адзіным) кандыдатам, калі б выказвала сумнеў, што ён атрымае перамогу яшчэ ў першым туры, гэта было б падобна на прагноз. Хоць бы на самай справе сведчыла пра жаданне змяніць тактыку, перайсці ад «элегантных перамог», да перамог, атрыманых праз барацьбу, праз вялікія намаганні, у выніку якіх народ пагадзіўся з перавагай Лукашэнкі. Хай бы пры гэтым Лукашэнка бэсціў апазіцыянераў як «ворагаў народа», але дазволіў ім раз'язджаць па гарадах і вёсках, карыстацца радыё, тэлебачаннем, «галоўнымі газетамі краіны», каб яны маглі данесці да публікі свае тлумныя думкі. Тут бы самі па сабе, нават без вялікіх грошай, заварушыліся журналісты, бо ім смяротна надакучыла эзопава мова, якой яны ўжо і самі не разумеюць, і таму прагнуць здаровай, рэпартажнай і эпатажнай брутальнасці.



Лужок перад рэзідэнцыяй у «Драздах»

На такі паварот разлічвалі тыя асобы з апазіцыйнага лагера, што год з лішнім таму выказвалі пажаданне перайсці да канструктыўнай супрацы з рэжымам. Але ніякага памкнення да «управляемой демократии» з боку Лукашэнкі не відаць. Ён, як той міліцыянт з «Асаблівасцей нацыянальнага палявання», калі мае торбу з поўнымі пляшкамі, то не кіне яе, хоць бы і мядзведзь за ім гнаўся. А ў Лукашэнкі торба, як і раней, поўная. Таму рукі прэч!

Ярмошынскія «прагнозы» зводзяцца да парцыяльнага агучвання патрэбнай па сцэнару інфармацыі. Яна не прагназуе, а паведамляе тое, што ведае і што лічыць неабходным паведаміць галоўны арганізатар выбараў. Гэта не сакрэт, бо калісьці, напачатку кар'еры, спадарыня Ярмошына публічна біла сябе кулакамі ў грудзі ў доказ поўнай сваёй адданасці прэзідэнту. Гэта было фактычным самавыкрыццём, але ж у нашай краіне ніхто ўвагі на такія дробязі не звяртае.

Зараз адданасці, мусіць, не паменела, але хітрасці стала больш. Дыпламатычнага, так бы мовіць, палітэсу. Нават айчынныя, не кажучы пра замежных, сацыяльныя пісьменнікі ў якасці адметнай рысы беларускага побытавага існавання называюць адсутнасць істотнай маёмаснай дыферэнцыяцыі ў грамадстве. Шмат чаго пры гэтым яны не ўлічваюць, але на самай справе такіх кантрастаў паміж багатымі і беднымі, як у іншых краінах, у нашай няма. Па прынятым напачатку 1990-х гадоў табелі аб рангах, у нас нават прэзідэнт і прэм'ер-міністр не павінны атрымліваць вялікае грашовае ўтрыманне. Цяжка сказаць, колькі — 5, 10 ці 15 мільёнаў рублёў, але не шмат. Не шмат нават у параўнанні з амерыканскай прыбіральшчыцай. Але ж тая жыве ў Амерыцы, а нашы — у Драздах. У нашых грошай небагата, але яны ж на ўсім гатовым. Ды яшчэ маюць доступ да рэсурсаў, якія нават сасніцца не могуць амерыканскай прыбіральшчыцы, бо насельнікам Драздоў у гэтай краіне належыць усё.

Ці трэба казаць, што блізу кожнай адміністрацыйнай адзінкі ёсць уласныя Дразды. Бывае, што яны нават выразна не лакалізаваныя на мясцовасці, але літаральна кожны тутэйшы дакладна ведае, дзе знаходзіцца мяжа, якую яму нельга пераступаць ні ў якім выпадку. Бо яны ў Драздах не патрэбныя, няма ім там чаго рабіць. Яны павінны жыць, дзе жывуць, бо ні ў якім іншым месцы жыць не могуць.

Але і «драздоўцы» па-за межамі сваіх анклаваў таксама нікому не патрэбныя. Яны тут губляюць усе свае жыццёвыя сілы. Як моркаўка, вырваная з градкі.

Магчыма, нават, што ні «драздоўцы», ні «тутэйшыя» такім становішчам не зусім задаволеныя — татальная залежнасць ад месца пасадкі не спрыяе развіццю асобы. «Тутэйшыя» разумеюць, што трапіць у Дразды цяжэй, чым у царства нябеснае, а «драздоўцы» ведаюць: калі што, назад дарогі не будзе...

Прынамсі таму Лукашэнка распачатую супраць яго рускімі інфармацыйную вайну слушна называе «бязглуздай». Таму што яны ж яго ў «дразды» і пасадзілі...

Бо вядома: не чалавек у нас упрыгожвае месца, а месца чалавека. У Расіі гэта так і называецца — «месніцтва».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 4 КАСТРЫЧНІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.30** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**09.10** «У цэнтры ўвагі».
**10.30** «Культурныя людзі».
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Апошні кардон» (Расія). Заключная серыя.
**12.10** Сямейная музычная камедыя «Элвін і бурундукі» (ЗША).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** Відэафільм АТН «Капітальнае партнёрства».
**16.10** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**17.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Маруся» (Украіна). 1-я серыя.
**18.50, 01.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Апостал» (Расія).
**23.35** Драма «Адшукваецца герой» (ЗША).
**01.25** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здарова!».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** Прэм'ера. «Галасы».
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Цвёрдая пасадка».
**00.35** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Я-вандроўца».
**13.00** «Ля параднага пад'езду».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Заселеная выспа». Расія.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Вяртанне ў Брайдсхед». Вялікабрытанія - Італія - Марока, 2008 г.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.10** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**12.10** Пра мастацтва.
**12.40** Школа рамонту.
**13.45** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.40** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Тэлебарометр.
**15.30** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыя «Сем нянек» (СССР).
**20.35** Калыханка.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** Беларуская часіна.
**22.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**22.45** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.15** Авертайм.
**23.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**00.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Не нарадзіся прыгожай. Майя Булгакава». Дакументальны фільм.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** Тэлесерыял «Дворык».
**13.25** «Гарадок».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.35** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.30** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.20** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.05** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія.
**22.20** «Нічога асабістага».
**22.35** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**00.30** Навіны - Беларусь.
**00.40** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».

**НТВ**

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.30** «Кулінарны паядынак».
**11.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Спадары прысяжныя».
**15.10** «Цуд-людзі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.45** «Школа зласлоўя».

**EUROSPORT**

**09.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя). Заезд 2.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA (Кітай). Дзень 1.
**16.15, 01.45** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Мужчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**17.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Супербайк. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя). Заезд 2.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**07.45** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**08.00** ПраСвет.
**08.25** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Алімпійскі смак».
**08.50** Прыватная калекцыя.
**09.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.25** Басанож па свеце: «Штодзённае жыццё ў Амазоніі».
**09.50** Дакументальная гадзіна: «13 гадоў, 13 хвілін...», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**10.40** «Малая Масква», тэлесерыял.
**11.25** Фільматэка майстроў: «Дзённік свавольнага дзіцяці», псіхалагічная драма, 1988 г., Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**17.35** «Малая Масква», тэлесерыял.
**18.20** Госць «Белсату».
**18.40** «Дзеці вялікага возера», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** Еўропа сёння.
**20.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 2.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Дзённік свавольнага дзіцяці», псіхалагічная драма, 1988 г., Францыя.
**23.50** Аб'ектыў.

## 5 КАСТРЫЧНІКА, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся» (Украіна). 1-я серыя.
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Камедыйная меладрама «Барын».
**14.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Відэафільм АТН «Іванаўская купель» цыклу «Зямля беларуская».
**16.15** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу». Закл. серыя.
**17.00** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся». 2-я серыя.
**18.50, 01.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Вострасюжэтны серыял «Апостал» (Расія). Заключная серыя.
**23.35** Камедыйная меладрама «Прыгажунчык» (Германія).
**01.45** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Уцёкі».
**22.15** «Звышчалавекі».
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.10** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Заселеная выспа». Расія, 2008 г.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прэм'ера! Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**23.55** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Камедыя «Сем нянек» (СССР).
**12.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**13.00** Авертайм.
**13.30** «Запал па культуры».
**14.15** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Хакей. КХЛ. Тарпеда (Ніжні Ноўгарад) - Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**23.15** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.45** «Спорт-кадр».
**00.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Уладар свету. Нікола Цесла». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** Тэлесерыял «Дворык».
**12.20** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.05** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.30** «Весткі.ru».
**23.45** Прэм'ера. «Адзіная Германія. За кулісамі трыўмфу». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Братва».
**15.10** «Жывуць жа людзі!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Прэм'ера. Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Вочная стаўка».
**00.45** «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). Дзень 2.
**16.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**17.00, 21.30** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Камандныя спаборніцтвы. Канкур. Кентукі (ЗША).
**19.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**00.00** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ. Агляд сезону.
**00.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя). Заезд 2.
**01.30** Мотаспартыўны часопіс.
**01.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**02.25** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 2.
**09.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.35** «Дзеці вялікага возера», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**10.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**10.30** «Познань'56», маст. фільм, 1996 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 5 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял: «Фанаты».
**18.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** ПраСвет.
**20.35** Вагон.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Абед з прэзідэнтам», Пакістан.
**22.35** Без рэтушы: «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**22.55** «Доктар Марцін», серыял: 5 серыя.
**23.40** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 6 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Серыял «Маруся». 2-я серыя.
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Крымінальная меладрама «Туды, дзе жыве шчасце» (Расія).
**14.05** Здароўе.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.10** Дак. серыял «Гараджане»: Мінск».
**16.35** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Серыял «Маруся». 3-я серыя.
**18.50, 01.35**«Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША). 1-я серыя.
**23.25** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Прыгажунчык-2» (Германія).
**01.40** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Гаражы».
**22.15** Асяроддзе пасялення.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Іван Дыхавічны. Удых-выдых».
**00.35** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** Прэм'ера! Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**23.55** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**09.40** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Меладрама «Канец бабінага лета».
**12.15** «Спорт-кадр».
**12.45** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**13.35** Медычныя таямніцы.
**14.10** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Эксцэнтрычная камедыя «Спортлато-82» (СССР).
**20.55** Калыханка.
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**23.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Рэальны свет.
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Ніхто не жадаў забываць. Будрайціс, Баніоніс і іншыя». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.00** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.05** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Назад у маладосць». Дак. фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Вочная стаўка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Развод па-руску».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Братва».
**15.10** «Прафесія Рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.35** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.55** «Вочная стаўка».
**00.45** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA (Кітай). Дзень 3.
**16.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**17.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Бельгія-Германія.
**18.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Эстонія-Італія.
**19.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.20** Абранае па серадах.
**20.25** Конны спорт. Канкур. Абранае. Партугалія.
**20.55** Пола. Залаты кубак (Іспанія).
**21.55** Навіны коннага спорту.
**22.00** Гольф. Тур PGA. Турнір Viking Classic.
**23.00** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.05** Ветразевы спорт. Кубак Rolex Swan. Італія.
**23.35** Ветразевы спорт. Рэгата World Match. Санкт-Морыц (Швейцарыя).
**00.05** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.15** Алімпійскі часопіс.
**00.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Бельгія-Германія.
**01.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Эстонія-Італія.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.35** Без рэтушы: «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**08.55** ПраСвет.
**09.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.35** Беларусы ў Польшчы.
**09.50** Вагон.
**09.55** «Бульбаны», мультсерыял: «Фанаты».
**10.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**10.35** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Абед з прэзідэнтам», Пакістан.
**11.30** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**11.40** «Доктар Марцін», серыял: 5 серыя.
**12.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 5 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Доктар Марцін», серыял: 5 серыя.
**18.20** Дакументальная гадзіна: «13 гадоў, 13 хвілін...», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**19.10** Вагон.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** На колах.
**20.15** Басанож па свеце: «Аазіс свабоды».
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Як Грэцыя і Партугалія сталі вялікімі турыстычнымі краінамі».
**21.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Алімпійскі смак».
**22.05** «Асцярожна, бандыты!», маст. фільм, 1986 г. Францыя.
**23.50** Аб'ектыў.

## 7 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Серыял «Маруся». 3-я серыя.
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Кінааповесць «Вячэрні звон» (Расія).
**13.35** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».
**14.30** «Славянскі базар». Абранае.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў (Беларусь).
**15.55** Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
**16.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Серыял «Маруся». 4-я серыя.
**18.50, 01.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Серыял «Ганначка». Закл. серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША). 2-я серыя.
**23.25** Крымінальная меладрама «Шэпт памяранцавых аблокаў» (Расія).
**01.20** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Банды».
**22.10** АНТ прадстаўляе: Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Дынама-Мінск» - «Чэхаўскія мядзведзі».
**23.50** Нашы навіны.
**00.10** Навіны спорту.
**00.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Нашы навіны.
**01.20** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Асабістыя інтэрас».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прэм'ера! Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**23.55** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Эксцэнтрычная камедыя «Спортлато-82» (СССР).
**12.20** Жансавет.
**13.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**14.00** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.55** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Лірычная камедыя «Самая абаяльная і прывабная» (СССР).
**20.45** Калыханка.
**21.00** Тэлебарометр.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.15** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**22.50** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.25** Час футболу.
**23.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Вяртанне. Эдуард Хіль». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.00** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.05** Прэм'ера. Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Паядынак».

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Праспявана ў СССР».
**12.10** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Братва».
**15.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Вочная стаўка».
**00.45** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Канкур. Абранае. Партугалія.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/8 фіналу.
**16.15** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Камандныя спаборніцтвы. Канкур. Фінал. Кентукі (ЗША).
**18.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Швейцарыя-Англія.
**19.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Боснія і Герцагавіна-Францыя.
**20.00** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**20.10** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый. Анкасвіль. ЗША.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.05** Вось дык так!!!
**00.10** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**00.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Швейцарыя-Англія.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Як Грэцыя і Партугалія сталі вялікімі турыстычнымі краінамі».
**08.05** Госць «Белсату».
**08.20** Дакументальная гадзіна: «13 гадоў, 13 хвілін...», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**09.15** Вагон.
**09.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Алімпійскі смак».
**10.05** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Аазіс свабоды».
**10.30** «Машына зменаў», тэлесерыял: 2 серыя.
**11.00** Доктар Марцін», серыял: 5 серыя.
**11.50** «Асцярожна, бандыты!», маст. фільм, 1986 г. Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял.
**17.35** «Асцярожна, бандыты!», маст. фільм, 1986 г. Францыя.
**19.15** Асабісты капітал.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Праект «Будучыня».
**20.15** Басанож па свеце: «Штодзённае жыццё ў Амазоніі».
**20.40** Хто ёсць кім?: Алесь Мех – беспрацоўны інжынер.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.55** Форум (ток-шоу): «Інваліды ў Беларусі».
**22.35** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 1 серыя.
**23.20** Аб'ектыў.

# 9 ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 8 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Серыял «Ганначка». Закл. серыя.
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Серыял «Маруся». 4-я серыя.
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Меладрама «Мужчына ў хаце».
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** «Школа доктара Камароўскага».
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**15.55** Прэм'ера. Дак. цыкл «Зброя будучыні» (Вялікабрытанія). 1-я серыя.
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.50** Серыял «Маруся». 5-я серыя.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** «Андрэй Міронаў. Звычайны цуд». Дакументальны фільм (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Прэм'ера. Камедыя «Па той бок ложку» (Францыя).
**23.55** Дакументальны цыкл «Зброя будучыні» (Вялікабрытанія). 1-я серыя.
**00.45** Дак. цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**01.35** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Люксембург-Беларусь.
**23.10** «Наша Белараша».
**23.45** Фільм «Казанова».
**01.45** Нашы навіны.
**02.00** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Мінскчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Высокі бландын у чорным чаравіку». Францыя, 1972 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Прадавец». ЗША, 2009 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія). Заключная серыя.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Лірычная камедыя «Самая абаяльная і прывабная» (СССР).
**12.15** Час футболу.
**12.40** Кінаспробы.
**13.00** Прэм'ера. Дак.-пазнавальны фільм «Версальскі садоўнік» (Францыя).
**13.55** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.55** Мультсерыял «Драконьчык і яго сябры» (Канада).
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).
**16.25** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Драма «Халоднае лета 53-га…» (СССР).
**21.00** Калыханка.
**21.15** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.05** Тэлебарометр.
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.15** Моладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**23.50** «Пра мастацтва».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.00** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** Прэм'ера. «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.05** Прэм'ера. Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**22.30** Навіны - Беларусь.
**22.40** Фільм «Журботная дама чарвякоў».
**00.25** Фільм «Чужы запал».

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Бітва за Поўнач».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Братва».
**15.10** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Гарэлка: гісторыя ўсерасійскага застолля».
**22.55** «Нтвшнікі».
**00.05** Прэм'ера. Баявік «Ідэальныя ўцёкі».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/8 фіналу.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/4 фіналу.
**16.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Боснія і Герцагавіна-Францыя.
**17.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Швейцарыя-Англія.
**18.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**19.55** Алімпійскія гульні. Часопіс.
**20.00** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**20.10** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Боснія і Герцагавіна-Францыя.
**21.00** Вось дык так!!!
**22.00** Боўлінг. Тур PBA. ЗША. Часопіс.
**23.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Калумбус (Агайо/ЗША).
**00.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**01.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/4 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**08.05** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**08.35** Форум (ток-шоу): «Інваліды ў Беларусі».
**09.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Штодзённае жыццё ў Амазоніі».
**09.40** Хто ёсць кім?: Алесь Мех – беспрацоўны інжынер.
**10.00** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял: 5 серыя.
**10.25** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 14 серыя.
**11.10** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 9 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял: 5 серыя.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 1 серыя.
**18.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 2.
**19.10** Маю права (прававаяпраграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 5 серыя: «Абед з прэзідэнтам», Пакістан.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**22.05** «Зямля запаветная», маст. фільм, 1974 г., Польшча.
**00.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Закаханая насмерць».
**01.00** Аб'ектыў.

## 9 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

### 1

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя».
**07.15** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.10** «Аўташкола». Перадача 1-я.
**10.55** Камедыя «Златое цяля» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**14.10** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**16.45** Відэафільм АТН «Дзеці Еўрабачання: Андрэй Кунец».
**17.10** Дакументальны серыял «Гараджане»: Барселона».
**17.40** Відэафільм АТН «Летапіс Жыткавіч» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.50** Фільм тыдня. Меладрама «Мільянер з трушчоб» (ЗША-Вялікабрытанія).
**00.00** Дзень спорту.
**00.10** Прэм'ера. Крымінальная драма «Брансон» (Вялікабрытанія).

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** «Залатая калекцыя «Беларусьфільма». «Чаго жадае глядач?».
**12.25** «На спіне ў чорнага ката». Маст.фільм.
**14.10** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Тур дэ Франс».
**17.15** Прэм'ера. «Марына Дзюжава. «Я уся такая раптоўная, супярэчлівая…».
**18.15** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.15** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка-5».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Восеньская серыя гульняў.
**22.30** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.10** Фільм «Парыж».

### СТВ

**07.00** «Адважны партны». Германія, 2008 г.
**08.00** Фільм «Высокі бландын у чорным чаравіку». Францыя, 1972 г.
**09.35** Прэм'ера! «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** Фільм «Я крочу па Маскве». СССР.
**15.20** «Дарагая перадача».
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Восеньскі вальс». Украіна.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Байцоўскі клуб». Германія - ЗША, 1999 г.
**00.05** Фільм «Жорсткая літасць». ЗША - Францыя - Іспанія, 2007 г.
**01.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.45** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.15** Усё аб бяспецы.
**08.40** Нашы тэсты.
**09.50** «Рэальны свет».
**10.25** Жансавет.
**11.10** Тэлебарометр.
**11.15** «Запал па культуры».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Заганы і іх прыхільнікі» (Расія). 1-я - 4-я , закл. серыі.
**15.50** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - «Лакаматыў» (Яраслаўль). Прамая трансляцыя.
**19.15** Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.15** Тэлебарометр.
**20.20** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (ЗША).
**22.45** Жывы гук.
**23.30** Меладрама «Шчасце Эмы» (Германія).

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Крывое люстэрка».
**08.45** Фільм «Чужы запал».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Журботная дама чарвякоў».
**13.10** «Нататкі натураліста».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Мая планета».
**14.25** Прэм'ера. «Абрамцава». Дакументальны фільм.
**15.15** Дэтэктыў «Начное здарэнне».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** Прэм'ера. «Носіка ведае кожны. Памяці караля эпізоду».
**20.35** Фільм «Завея». 2010 г.
**23.50** Фільм «На сямі вятрах».
**01.40** Дэтэктыў «Начное здарэнне».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Фантастыка «Загадка Сфінкса».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. «Справа цёмная».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руськія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Майстар».
**00.55** «Дзідзюля: інструментальнае шоў LIVE!».

### EUROSPORT

**09.30** «Еўраспорт за чыстую планету».
**10.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/2 фіналу.
**13.55** Алімпійскія гульні. Часопіс.
**14.00, 15.00, 17.00, 19.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**15.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Барселона (Іспанія). Гонка 1.
**17.45** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/2 фіналу.
**20.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**20.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**21.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. К 1. Кубак World Combat. Нідэрланды.
**22.15** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Агляд.
**00.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**01.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**02.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Невядомая Беларусь: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**08.35** Маю права (прававаяпраграма).
**08.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 2.
**09.50** «Чароўнае дрэва», серыял: 5 серыя.
**10.15** Калыханка для самых маленькіх.
**10.55** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 5 серыя: «Абед з прэзідэнтам», Пакістан.
**11.50** «Зямля запаветная», маст. фільм, 1974 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял: 5 серыя.
**18.00** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Правіньцыя», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Кім быў Кірыла Тураўскі?»
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Абрад жабы».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Астэрыкс на алімпіядзе», маст. фільм, 2008 г., Францыя–Іспанія–Германія.
**23.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Бессэнсоўнасць жыцця».
**23.20** Аб'ектыў.

## 10 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

**08.05** Дзень спорту.
**08.15** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША - Вялікабрытанія).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** Культурныя людзі.
**10.45** «Школа доктара Камароўскага».
**11.20** Камедыя «Каханне і галубы» (СССР).
**13.40** Дакументальны цыкл «Невядомая версія» (Украіна).
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.00** Сямейная камедыя «Пажарны сабака» (ЗША - Канада).
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.00** Прэм'ера. Драма «Дзяўчына ў парку» (ЗША).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25** «Шчасце ёсць!».
**13.15** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.45** «Віктар Паўлаў. Лёс мяне захоўваць стаміўся».
**14.45** Фільм «Самагоншчыкі».
**15.10** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся».
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.45** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: шоў «Кухня».
**21.40** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя». Працяг.
**23.30** «Што? Дзе? Калі?».
**00.45** «Yesterday live».

### СТВ

**06.30** «Столік-сам-накрыйся». Германія, 2008 г.
**07.30** Фільм «3 жыцця адпачываючых». СССР, 1980 г.
**09.00** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «Кажа і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева». СССР, 1970 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Застанься». ЗША, 2005 г.
**22.35** «Прафесійны бокс».
**23.35** Канцэрт «3G DANCE».
**00.15** Фільм «Феерверк». Японія, 1997 г.
**02.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.45** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.20** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.50** Нашы тэсты.
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Школа рамонту.
**11.50** Тэлебарометр.
**11.55** Бухта капітанаў.
**12.35** «Правы чалавека».
**12.50** Гаспадар.
**13.20** Кінаспробы.
**13.35** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (ЗША).
**16.15** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША). Заключная серыя.
**17.10** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**18.10** Драма «Час зямлянкі» (Расія).
**19.55** Смешная часіна.
**20.30** Тэлебарометр.
**20.50** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**23.30** Культасвет.

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт».
**07.30** Фільм «Завея». 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «24-25» не вяртаецца».
**14.00** Весткі.
**14.20** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** Прэм'ера. Усе зоркі «Новай хвалі» у Артэку.
**17.15** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Сумленны дэтэктыў».
**20.30** «Адмысловы карэспандэнт».
**21.00** Прэм'ера. Фільм «Зваротны шлях». 2010 г.
**23.05** Фільм «Калі бракуе кахання». 2008 г.
**00.45** Фільм «Жаўрук».

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**11.00** «Праспявана ў СССР».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Бітва за Поўнач.
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Развод па-руску. Школа рэкету».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. «Марскія д'яблы. Лёсы».
**23.55** «Асабліва небяспечны!».
**00.35** «Нерэальная палітыка».

### EUROSPORT

**09.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**09.35** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**10.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**11.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**12.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**13.00** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Канкур. Фінал. Кентукі (ЗША).
**14.30** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). Фінал.
**16.15** Веласпорт. Велагонка «Тур Парыжу». Францыя.
**18.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**18.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**19.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**20.00** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**20.10** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Выездка. Кентукі (ЗША).
**21.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Барселона (Іспанія). Гонка 2.
**21.45** Мотаспартыўны часопіс.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBO. Германія.
**00.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). Фінал.
**01.15** Веласпорт. Велагонка «Тур Парыжу». Францыя.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кім быў Кірыла Тураўскі?»
**08.15** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**08.25** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Абрад жабы».
**08.50** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Правінцыя», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**09.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.45** Калыханка для самых маленькіх.
**10.15** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**11.15** «Астэрыкс на алімпіядзе», маст. фільм, 2008 г., Францыя–Іспанія–Германія.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**17.40** «Малая Масква», тэлесерыял.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Я помнік сам сабе...», дак. фільм, 2009 г., Украіна.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Бітва з татарамі пад Альшаніцаю».
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.00** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце: «Ізраэліты».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак алею ды віна».
**22.00** Фільматэка майстроў: «Інлэнд Імпаяр», маст. фільм, 2006 г., ЗША–Францыя–Польшча.
**00.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Княжна».
**01.05** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ВЫБАРЫ

# КАІН І АВЕЛЬ





Эд і Дэвід Мілібэнд

Алег НОВІКАЎ

**У Вялікабрытаніі прайшлі выбары старшыні Лейбарысцкай партыі, якім у выніку барацьбы з родным братам сенсацыйна стаў Эд Мілібэнд.**

Вынік партыйнай канферэнцыі лейбарыстаў, якія абіралі свайго лідэра, быў непрадказальны да самага апошняга моманту. Пасля першага і другога туру напярэдадзе быў Дэвід Мілібэнд, які, аднак, не сабраў патрэбнай большасці. Ягоным галоўным канкурэнтам аказаўся родны брат Эд. Усё павінен быў вырашыць трэці этап. І тут адбылася сенсацыя. Дзякуючы падтрымцы прафсаюзаў, з перавагай у 1,3 працэнта, перамогу святкаваў малодшы з Мілібэндаў.

Гонка за права стаць старшынёй вядучай апазіцыйнай партыі пачалася 10 мая, праз тры дні пасля ўсеагульных парламенцкіх выбараў. На выхадзе з тых выбараў Аб'яднанае Каралеўства атрымала так званы «падвешаны парламент» — парламент без большасці. Ні лейбарысты, ні торы не маглі сфармаваць урад. Усё залежала ад трэцяй партыі — ліберал-дэмакратаў, якія аказаліся ўладальнікамі залатой акцыі. Жоўтыя (жоўты — партыйны колер лібералаў) вырашылі будаваць Кабмін з кансерватарамі.

Такім чынам, левыя пасля 13 гадоў знаходжання на Даўнінгстрыт, 10 адправіліся ў апазіцыю. Адначасова Гордан Браўн абвясціў пра свой сыход у адстаўку з пасады кіраўніка партыі. Таму Нацыянальны выканаўчы камітэт лейбарыстаў прызначыў на 25 верасня партыйную канферэнцыю, якая павінна была абраць новага старшыню.

Адпаведна статуту, для таго, каб які-небудзь партыец стаў кандыдатам на пасаду лідэра, яму трэба перш за ўсё заручыцца патрэбнай колькасцю подпісаў дэпутатаў фракцыі лейбарыстаў. Кандыдата на пасаду партыйнага боса павінна падтрымліваць 12,5 працэнта парламенцкай групы лейбарыстаў. Цяпер у Палаце абшчын 257 лейбарыстаў. Такім чынам, для выстаўлення сваёй кандыдатуры было патрэбна 33 подпісы.

Наступны этап — галасаванне. Галасуюць лейбарысты па цікавай схеме, падобнай на тую, па якой галасавалі ў царскай дзяржаўнай думе. Там былі гэтак званыя курыі — карпарацыі выбаршчыкаў: арыстакраты, гарадскія абываталі, сяляне і г.д. Нешта падобнае і ў лейбарыстаў. Існуюць тры групы: дэпутаты парламенту, сябры партыі і актывісты сяброўскіх арганізацый (прафсаюзы, жаночыя арганізацыі, інтэлектуальныя гурткі). Кожная з трох груп кантралюе трэціну ад агульнай колькасці выбаршчыкаў партыйнага старшыні.

Цяжка сказаць, нашто было выдумляць такі складаны механізм. Магчыма, у тым ліку для таго, каб не дапусціць у кіраўніцтва якога-небудзь папуліста. Нагадаем, што ў брытанскай палітычнай культуры ёсць паняцце «энтрызм», якое значыць пранікненне ў вялікую партыю сяброў маргінальнай секты з мэтай расколу структур партыі або выкарыстання яе рэсурсаў. Найбольш на гэтай глебе адзначыліся трацкісты, якія двойчы ўмудрыліся ўвайсці ў шэрагі лейбарыстаў і, разлажыўшы іх, забралі да сябе ўсю лейбарысцкую моладзь. Таму такая сістэма высоўвання кандыдата, магчыма, ёсць добрым сродкам ад з'яўлення рознага кшталту авантурыстаў.

Аднак на гэты раз формула перастрахоўкі цалкам не спрацавала. Магчыма, папросту не магла спрацаваць. Ад кожнага кандыдата, у сілу палітычнай кан'юнктуры, патрабавалася крытыкаваць спадчыну Тоні Блэра, на якога ўсклалі адказнасць за ўсе правалы лейбарыстаў апошніх гадоў. Што кандыдаты дружна і здзяйснялі. Аднак, калі крытыкі сфакусаваліся на асобе Тоні Блэра, дык міжволі зрабілі яго вяршыцелем лёсу партыі. Напярэдадні выбараў Тоні Блэр, адпаведна канонам партыйнай традыцыі, павінен быў падтрымаць кагосьці з кандыдатаў.

Яўным фаварытам лічыўся Дэвід Мілібэнд, былы міністр замежных спраў. Сярод тых, хто складаў яму канкурэнцыю, можна было вылучыць дзвюх асобаў. Па-першае, Дыяну Эбат — першую ў гісторыі краіны чарнаскурую жанчыну, якая стала дэпутатам парламенту. Дыяна з усёй эмацыйнасцю, якую ўспадкавала ад бацькоў з Ямайкі, атакавала партыйны істэблішмент. Аднак сур'ёзным кандыдатам пры гэтым яе не лічылі. Другім і галоўным праціўнікам Дэвіда нечакана для ўсіх стаў ягоны родны брат Эд.

Увогуле, сям'я Мілібэндаў мае трывалыя левыя традыцыі. Ральф, бацька Эда і Дэвіда, апынуўся ў Вялікабрытаніі з апошнім караблём, які вывозіў з Дзюнкерку салдат брытанскага экспедыцыйнага корпусу, што ў 1940-м дапамагаў французам у вайне супраць Гітлера. Да гэтага ён жыў у Брусэлі. Пасля пераезду ў Лондан на магіле Карла Маркса Ральф Мілібэнд прыняў прысягу быць верным справе пралетарыяту і, мяркуючы па тым, які статус у левым руху займаюць ягоныя сыны, выканаў сваё абяцанне.

Яшчэ падлеткамі Эд і Дэвід далучыліся да лейбарыстаў. Дарэчы, усю генерацыю цяперашніх лідэраў лейбарыстаў можна лічыць унукамі Маргарэт Тэтчэр. Яны прыйшлі ў палітыку ў першай палове 1980-х , калі жалезная лэдзі пачала зачыняць шахты, спраўкакаваўшы славутыя пратэсты гарнякоў і актывізацыю левых.

Пасля заканчэння ВНУ браты рабілі кар'еры і адначасова актыўна ўдзельнічалі ў жыцці партыі. Эду і Дэвіду пашанцавала — у 1992 годзе лейбарысты вярнуліся ва ўладу. Ім былі патрэбныя свае кадры на розныя высокія пасады ў дзяржаўным апараце. Мілібэнды хуценька прасоўваюцца ва ўладу. Дэвід становіцца дырэктарам МЗС, ягоны брат Эд узначальвае Міністэрства барацьбы з сусветным пацяпленнем. Паралельна яны абіраюцца ў парламент. Нарэшце, пасля паразы лейбарыстаў на выбарах, абодва вырашылі пазмагацца за пасаду партыйнага старшыні.

Здавалася, што асаблівай розніцы паміж поглядамі братоў не існуе. Аднак, пакапаўшыся ў нядаўняй гісторыі, эксперты прызналі, што Эд усё ж больш за Дэвіда чыніў супраціў кіраўніцтву партыі ў асобе Тоні Блэра і Гордана Браўна. Так, ён адкрыта выступіў супраць інтэрвенцыі ў Ірак. Гэтай дробязі хапіла, каб вакол малодшага з Мілібэндаў сфармаваўся німб вялікага левага апазіцыянера Тоні Блэру, хаця істотных ідэйных супярэчнасцяў паміж братамі няма. Эд нават паабяцаў, што дасць Дэвіду ў выніку перамогі пасаду старшыні ценявога ўраду.

Аднак вырашальную справу зрабіў фактар Тоні Блэра. Ён, ягоны духоўны бацька экс-шэф партыі Нэйл Кінак і нядаўні прэм'ер Гордан Браўн заклікалі галасаваць за Дэвіда. Як і варта было чакаць, той у выніку прайграў.

Цяпер усе гадаюць, якім будуць новыя лейбарысты, што самі сябе называюць next labour (наступныя лейбарысты). Сам Эд кажа: ён "прадстаўляе новую эру ў палітыцы", што, зразумела, гучыць нейк абстрактна. Правая прэса акцэнтуе ўвагу на тым, што сваёй перамогай Эд абавязаны прафсаюзам. Цяпер новы старшыня мусіць лабіраваць інтарэсы прафсаюзных босаў, а гэта пагражае рэмейкам 1970-х. Тады, будучы кліентам прафсаюзаў, лейбарысты страцілі падтрымку сярэдняга класу і адкрылі шлях ва ўладу кансерватарам.

20 кастрычніка будуць большменш вызначаны контуры новых лейбарыстаў, калі кабінет Дэвіда Камерона прапануе план эканоміі дзяржаўных расходаў, а партыя Эда Мілібэнда — сваю канструктыўную альтэрнатыву.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Справа ў тым, што паміж Масквой і Мінскам існуюць гандаль, барацьба. У гэтай барацьбе з боку Крамля робіцца акцэнт на асобе Лукашэнкі… Крэмль звяртае ўвагу, што Лукашэнка — прычына бед беларускага народа. Усе фільмы, якія паказваліся па расійскім тэлебачанні, былі закліканыя пераканаць расійскага гледача, расійскага абывацеля, у якога Лукашэнка даволі папулярны, у тым, што барацьба вядзецца не супраць Беларусі, не супраць беларускага народа, нават не супраць беларускага ладу, а выключна супраць беларускага прэзідэнта, які ў дадзеным выпадку закранае інтарэсы Расіі.

**«Голос России» (Расія)**

На «лекцыі» ў Акадэміі кіравання пры прэзідэнце (ВНУ, якое спецыялізуецца на падрыхтоўцы «ідэолагаў») А. Лукашэнка заявіў: «Мы пакуль ніякай дзяржаўнай ідэалогіі не сфармавалі». Так ён адказаў студэнтцы, якая здала залік па «Асновах ідэалогіі беларускай дзяржавы», і публічна выставіў прафесарска-выкладчыцкі склад Акадэміі пры прэзідэнце (у прыватнасці, кафедру ідэалогіі і палітычных навук і прарэктара па ідэалагічнай працы), мякка кажучы, дзіўнымі людзьмі.

**REGNUM (Расія)**

Выбары ў Беларусі пачаліся са скандалу. Лукашэнка зноў рэгіструецца з істотнымі парушэннямі. У чарговы раз Мінск даказвае ўсяму свету, што законы створаныя для таго, каб іх сістэматычна парушаць і не ўспрымаць сур'ёзна. Цэнтравыбаркам Беларусі зарэгістраваў апошняга, 17-га кандыдата ў прэзідэнты краіны Аляксандра Лукашэнка з парушэннямі. Паводле беларускіх законаў, кандыдат павінен асабіста з'явіцца ў Цэнтравыбаркам, каб зарэгістравацца для ўдзелу. Насуперак заканадаўству, А. Лукашэнка, як і пяць гадоў таму, не з'явіўся. За яго падаваў заяўку міністр адукацыі А. Радзькоў.

**«Газета» (Расія)**

Яшчэ занадта рана пра нешта казаць. Звяртаць увагу трэба на дзве рэчы. З аднаго боку, вельмі асцярожна можна канстатаваць, што атмасфера гэтым разам крыху больш ліберальная, чым падчас мінулых выбарчых кампаній. Пра гэта сведчыць і гатоўнасць беларускіх уладаў працаваць з міжнароднымі назіральнікамі. …Яшчэ адно відавочнае адрозненне гэтай кампаніі ад мінулых — гэта тое, што сітуацыя ў эканоміцы стала адной з вядучых тэм кампаніі.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Расія актыўна шукае якога-небудзь саюзніка, які быў бы «сваім чалавекам» у Еўрасаюзе. Даўным-даўно стала ясна, што на гэтым шляху Лукашэнка — зусім не патрэбны і нават шкодны баласт. Пры гэтым змяніць яго цяжка. Па-першае, з-за адсутнасці моцных праціўнікаў, а па-другое, з-за таго негатыўнага прыкладу, які дала суседзям Украіна часоў Ючшанкі. Таму народ беларускі, як гэта ні парадаксальна, не хоча змены дакучлівага вусатага Бацькі, мяркуючы, не без дастатковых падстаў, што іншыя будуць яшчэ горшыя.

**«Фокус» (Украіна)**

Пакуль усе патэнцыйныя ўдзельнікі прэзідэнцкай гонкі занятыя сабой і сваімі ініцыятыўнымі групамі. Тэма аб'яднання апазіцыі і вылучэння адзінага кандыдата на пэўны час страціла актуальнасць. Аднак у палітычным асяроддзі, мяркуючы па ўсім, яшчэ разлічваюць, што да яе можна будзе вярнуцца пасля таго, як кандыдаты ў кандыдаты выйдуць на фінішную прамую, гэта значыць, атрымаюць пасведчанні кандыдатаў у прэзідэнты. Этап збору подпісаў дапамажа шматлікім кандыдатам развітацца з ілюзіямі і неапраўданымі амбіцыямі, што падштурхне апазіцыю да аб'яднання.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЧЫЛІ. ГАЛОЎНАГА ПАРТЫЗАНА ЗБІРАЮЦЦА СУДЗІЦЬ

Прэзідэнт Чылі Себасцян Піньера падчас сустрэчы з аргенцінскай калегай Крысцінай Кіршнер папрасіў выдаць чылійскім уладам Гальварына Серхіа Апабласа, былога лідэра Патрыятычнага фронту імя Мануэля Радрыгеса (FPMR). FPMR у часы Пінахэта быў вайсковым аддзелам камуністычнай партыі і займаўся забойствамі галоўных бонзаў рэжыму. Адзін раз камуністы нават ледзь не забілі самога дыктатара. Калі ў 1990 годзе пачаліся перамены, Патрыятычны фронт імя Мануэля Радрыгеса працягнуў сваю актыўнасць і ў 1991 годзе забіў сенатара і вядомага бізнесмена. Менавіта за гэтыя злачынствы ўлады Чылі збіраюцца судзіць Апабласа, які цяпер хаваецца ў Аргенціне. Увогуле, не зразумела, чаму экс-шэф FPMR збег у Аргенціну, а не на Кубу, куды эміграваў пасля перавароту 1973 года. Дарэчы, там жа ён навучаўся вайсковай справе. Спадарыня Кіршнер ужо паабяцала чылійцам экстрадыцыю 59-гадовага партызана на радзіму. Цікава, што калі прэзідэнтам быў яе муж Нестар Кіршнер, Буэнас-Айрэс адмовіў Санцьяга ў выдачы Апабласа.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ГЕРМАНІЯ. АКТОБЭРФЭСТ ГАТОВЫ ДА ТЭРАКТАЎ

На славутым піўным фестывалі ў Мюнхене, які пачынаецца на гэтым тыдні, упершыню з часоў яго існавання будуць уведзены меры антытэрарыстычнай бяспекі. Падставай для гэтага стала інфармацыя ў інтэрнэце пра тое, што ісламскія фундаменталісты рыхтуюць акцыі. Па-першае, забароненыя ўсе палёты самалётаў над зонай піўнога свята. Па-другое, вакол паўсюдна пастаўленыя высачэзныя бетонныя слупы. Яны павінны не дапусціць падзення на п'яны натоўп самалёту, захопленага ісламістамі. Стаўка вельмі высокая. Калі тэрарысты змогуць арганізаваць нейкую правакацыю, гэта адаб'ецца на цікавасці публікі да Актобэрфэсту, на якім Баварыя зарабляе штогод 830 мільёнаў еўра. Застаецца дадаць, што ў пачатку 1980-х гадоў выбух на Актобэрфэсце ўсё ж прагучаў. Ад бомбы, якую заклаў неанацыст, загінула некалькі чалавек.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**



### ПОЛЬШЧА. ПРАЦІЎНІКІ КРЫЖА АБ'ЯДНАЛІСЯ

Неадназначна скончыліся баталіі вакол крыжа ў гонар ахвяр смаленскай катастрофы, які ўсталявалі ля прэзідэнцкага палацу ў Варшаве. Улады хацелі перанесці крыж у бліжэйшы касцёл. Сябры ж кансерватыўнай партыі «Права і справядлівасць» (PiS), у сваю чаргу, баранілі яго. Нарэшце — пасля шэрагу сутычак з паліцыяй і мора эмоцый — крыж пераехаў. Акрамя таго, адбылася відавочная палярызацыя грамадства і палітызацыя новай сацыяльнай групы. Маюцца на ўвазе 20–30-гадовыя людзі, якія выступаюць супраць «пісасізацыі» Польшчы. Упершыню пра іх пачалі казаць яшчэ ўвесну, калі Саюз левых дэмакратаў (SLD) — былая партыя камуністаў — сабраў за іх кошт 11 працэнтаў галасоў на прэзідэнцкіх выбарах. Канфлікт з крыжам зноў прымусіў газеты пісаць пра малады антыклерыкалізм, а палітыкам даводзіцца думаць, як атрымаць іх галасы. Акрамя левых дэмакратаў, за сімпатыі моладзі вырашылі пазмагацца і лібералы з кіруючай у краіне партыі «Грамадзянская платформа» (PO). Дакладней, частка лібералаў, аб'яднаных вакол асобы Януша Палікота, заўзятага праціўніка касцёлу. На 2 кастрычніка прызначана першая сустрэча Руху падтрымкі Палікота (RPP), які збіраецца аспрэчыць у левых імідж галоўнай антыклерыкальнай сілы ў грамадстве. Самі левыя, аднак, кажуць, што з такой біяграфіяй, як у Палікота (ён пачынаў у бізнесе з выдання каталіцкага часопіса), яго праект несур'ёзны і доўга не праіснуе.

**Па матэрыялах «Wprost» (Польшча)**

### ГРУЗІЯ. ФСБ РЫХТУЕ ПРАВАКАЦЫІ

Міхаіл Саакашвілі, прэзідэнт Грузіі і галоўны геапалітычны праціўнік Крамля ў зоне Садружнасці, заявіў, што мае інфармацыю наконт планаў Уладзіміра Пуціна вярнуцца ва ўладу. Пры гэтым Саакашвілі баіцца, што ў якасці сродку прыцягнення электарату ВВП можа пайсці на розныя правакацыі. Накшталт той, што, быццам, была арганізаваная напярэдадні абрання яго прэзідэнтам у 2001 годзе. Гаворка пра серыю таямнічых тэрактаў у розных гарадах Расіі, следствам якіх стала вайна з Чачнёй. Гуляючы на патрыятычных лозунгах, Пуцін лёгка здабыў падтрымку грамадства. Па словах грузінскага лідэра, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Расіі ў 2012 годзе цалкам рэальна паўтарэнне сцэнару 2001-га з той розніцай, што ролю Чачні ў новай схеме будзе выконваць Грузія. Цяжка сказаць, наколькі праўдзівая інфармацыя з Тбілісі. На думку экспертаў, магчыма, яе галоўны адрасат — не грузіны, а Амерыка і Захад, які апошнім часам бяруць дыстанцыю ад рэжыму Саакашвілі.

**Па матэрыялах «Newsweek» (ЗША)**

ЦІКАВА

# НЕ АПОШНЯЕ ВЫГНАННЕ Д'ЯБЛА



Габрыэль Аморт

**На экраны кінатэатраў выходзіць галівудскі фільм «Апошняе выгнанне д'ябла», які ў чарговы раз эксплуатуе тэму экзарцызму (выгнанне дэманаў з цела чалавека). Габрыэль Аморт — 85-гадовы галоўны экзарцыст Ватыкану, старшыня міжнароднай асацыяцыі экзарцыстаў, з нагоды прэм'еры фільму падзяліўся з французскім выданнем «Figaro magazine» сакрэтамі сваёй прафесіі.**

***— У 1986 годзе вы сталі адказваць у Ватыкане за выгнанне сатаны з людскіх целаў. І як ідуць справы пасля дваццаці гадоў баталій з сатаной? Наколькі гэта пасада змяніла ваша жыццё?***

— Цяпер я цалкам прысвячаю сваё жыццё заняткам па экзарцызму. Я лічу, што актаў экзарцызму павінна быць як мага больш. Даводзіцца працаваць штодня — з ранку да вечара, без выходных і адпачынкаў на Каляды або Вялікдзень. Калі кардынал Палецці ў 1986 годзе перадаў мяне дакумент, адпаведна якому я станавіўся галоўным экзарцыстам у Касцёле, я звярнуўся да Мадонны з малітвай — вазьмі мяне пад сваю абарону. Праз амаль 20 гадоў сваёй працы на гэтай пасадзе я мушу канстатаваць адну рэч — д'ябал вельмі моцная істота, і часам ён нараджаецца нават у сценах царквы.

***— Што вы думалі пра д'ябла спачатку, калі занялі гэту пасаду?***

— Кажучы праўду, я не вельмі хваляваўся на гэты конт. У Модзене — горад, адкуль я родам, — я ніколі не чуў пра такія рэчы, як экзарцызм. Я, натуральна, ведаў, што Люцыфер існуе. Я шмат думаў пра Евангелле. Прайшло больш за 50 гадоў. Я зразумеў перш за ўсё, наколькі важная падрыхтоўка і адукацыя царкоўнікаў. Яны, з аднаго боку, павінны ведаць усё, што тычыцца рэальнасці існавання д'ябла, а з другога — працаваць з моладдзю, якая цікавіцца рознымі акультнымі навукамі. Каб пераканаць моладзь, трэба сапраўды добра падрыхтаваны царкоўнікі. Шкада, аднак большасць слуг Касцёлу пакуль слабыя ў гэтай галіне.

***— Як вы вызначаеце, што ў чалавека ўсяліўся д'ябал?***

— Нягледзячы на тэхнічны прагрэс, выключна мы, экзарцысты, захавалі здольнасць ставіць сапраўдны дыягназ. У д'ябла няма ніякіх абмежаванняў, калі ён намагаецца забраць у чалавека душу. Калі мы размаўляем у кантэксце гістарычнай перспектывы і параўноўваем актуальныя кантакты д'ябла з тымі, што былі зафіксаваныя раней, усё вельмі змянілася. Тое, што раней разглядалася як апантанасць дэманамі, цяпер часта лічыцца псіхічнай хваробай. Таму патрэбны экзарцыст, які здольны праверыць, ці гэта сапраўды псіхічная хвароба ці справа ідзе пра нейкае вядзьмарства? Можна рабіць высновы на аснове правакацый, праз рэакцыю на святую ваду або працэдуру літургіі. Калі чалавек адмаўляецца піць святую ваду, тое шмат пра што кажа. Гэта дапамагае даведацца, ці ёсць чалавеку д'ябал.

***— Як дзейнічае сатана цяпер?***

— У мяне быў адзін дзень, калі я сапраўды паверыў у існаванне д'ябла. Мушу прызнаць, што мой досвед быў вельмі шакуючым для мяне, і спатрэбіўся час, каб зразумець, як дзейнічаць падчас кантактаў з дэманам. Малітвы экзарцыстаў — гэта не пераж ытак мінулага. Яны патрэбныя сёння. Сатана як ніколі актыўны. Сёння ён настаўляе як мага больш людзей на разбурэнне свайго арганізму і здароўя, на ўнутраную смерць. Шмат у такіх выпадках залежыць ад асобы. Усё адбываецца ва ўмовах вельмі далікатных, часам вельмі эмацыйных. Мы павінны быць надзвычай уважлівымі, паколькі ў свеце, у якім мы жывем і працуем, д'ябал шукае сродкі, каб разбурыць Царкву і веру ў Хрыста. Тут вельмі важна навучыцца працаваць з медыкамі, яны ж, у сваю чаргу, павінны зразумець ролю царквы ў лячэнні псіхічных хвароб, якія, на нашу думку, выкліканыя не працэсамі ў арганізме або спадчыннымі чыннікамі. Мяне вельмі цешыць, што хворыя псіхічныя звяртаюцца да мяне па дапамогу. Аднак я заўсёды раю спачатку паказацца псіхолагам.

***— Вашы пацыенты не баяцца прыходзіць да вас у кабінет на сеанс выгнання дэмана? Напэўна, ім вельмі страшна?***

— Так ці інакш, яны мусяць прыйсці. Часам іх прыводзяць іх родныя. Часам яны пры гэтым смяюцца або плачуць, або, наадварот, на іх находзіць апатыя. Падчас падрыхтоўкі да сеансу выгнання д'ябла клімат адносін паміж намі становіцца звычайна больш добрым. Зразумела, што непасрэдна атмасфера падчас сеансу вельмі напружаная. Мы павінны шмат маліцца. І акрамя таго, у некаторых выпадках (яны, праўда, бываюць рэдка), калі выяўляецца сапраўды прысутнасць дэмана, людзі ўпадаюць у транс. Мы кажам пра тое, што яны знаходзяцца ў стане, калі дэман выходзіць з іх. Дэман у такіх выпадках пачынае размаўляць за людзей.

***— І што кажа сатана ў такія моманты? Нейкія незвычайныя рэчы?***

— Да мяне прыйшла жанчына гадоў 50. У яе была дачка і нават унукі. І нечакана ў яе пачаліся прыступы. Яна распавяла, што прыступ першы раз здарыўся пасля вяселля. Яна пабачыла, як нейкая дзіўная фігура рухаецца па кватэры, мэбля дрыжыць. Прыйшлося рабіць сеанс. Падчас акту экзарцызму жанчына ўвайшла ў транс, і дэман пачаў са мной размаўляць. Ён пагражаў мне. Я яму сказаў: «Ты не здольны нічога мне зрабіць, паколькі я міністр Хрыста». Праз восем дзён мы зрабілі наступную працэдуру экзарцызму з той жанчынай. Яна нечакана пачала паліваць нас брудам. А пасля раптам я пачуў голас дэмана: «Я падпарадкоўваюся табе». Пасля гэтага жанчына прачнулася. Цяпер яна не скардзіцца на здароўе.

**Падрыхтаваў Іван Біч**

ДЭБАТЫ

# КАНДЫДАТЫ, ДА БАР'ЕРУ!

Алег НОВІКАЎ



**50 гадоў таму ў ЗША ўпершыню ў гісторыі адбыліся дэбаты паміж кандыдатамі на пасаду прэзідэнта, у якіх удзельнічалі Рычард Ніксан і Джон Кенэдзі. З тых часоў дэбаты кандыдатаў сталі часткай палітычнай культуры дэмакратычных краін і шмат разоў мянялі ход выбараў.**

Першы раз амерыканскі прэзідэнт з'явіўся на экранах тэлевізараў у 1939 годзе. Франклін Рузвельт пагадзіўся прайсці перад камерай. Ніякага значэння ён гэтаму не надаў. На той час тэлебачанне рабіла толькі першыя крокі.

Аднак ужо праз дзесяць гадоў яно стала моцнай медыйнай зброяй. У 1947 годзе Гары Трумэн упершыню з'звярнуўся да амерыканцаў праз тэлебачанне, прычым у прамым эфіры. Цікавая была тэма ягонага выступу: гарант заклікаў суайчыннікаў скараціць спажыванне мясных прадуктаў, каб павялічыць аб'ёмы паставак мяса ў Еўропу ў рамках плана Маршала.

У наступным годзе ў краіне адбыліся прэзідэнцкія выбары, на якіх кандыдату ад дэмакратаў Адлаю Стывенсану супрацьстаяў славуты генерал Айк Эйзенхаўэр. Шансаў на перамогу ў пераемніка Трумэна было няшмат. Аднак, трэба прызнаць, змагаўся ён упарта. У тым ліку вырашыў эксплуатаваць тэлевізію. На канале CBS пад выступ Стывенсана быў куплены час. Кандыдат зрабіў суперпрамову, разбіўшы ўшчэнт свайго канкурэнта.

Аднак пры гэтым паліттэхнолагі кандыдата прамаргалі той факт, што звычайна ў час, які яны выкупілі пад выступ Стывенсана, на канале паказвалі папулярны тэлесерыял «I love Lucy». Таму эфект ад прамовы Стывенсана быў, хутчэй, для яго выбарчай кампаніі адмоўным. Фанаты «I love Lucy» не прабачылі кандыдату ад дэмакратаў адсутнасці ў сетцы праграм любімай мыльнай оперы.

Хутка ўзнікла ідэя правядзення на тэлебачанні дэбатаў кандыдатаў ад вядучых партый. Падчас выбараў 1956 года дырэкцыя ўніверсітэту Балтымара прапанавала кандыдатам рэспубліканцаў і дэмакратаў сустрэцца з аўдыторыяй студэнтаў і адказаць на іх пытанні. Усё гэта павінна было трансляваца на тэлевізіі. Ідэя спадабалася выбарчым штабам абедзвюх партый, аднак да рэалізацыі справа не дайшла.

Дэбаты адбыліся толькі на наступных выбарах. Такім чынам, 24 верасня 1960 года ў чыкагскай студыі CBS сустрэліся Рычард Ніксан і Джон Кенэдзі. Цікавасць да іх дуэлі была каласальнай. Калі верыць статыстыцы, за чатыры раундамі дэбатаў сачылі 60 мільёнаў чалавек.

На думку гісторыкаў, менавіта дэбаты дапамаглі Кенэдзі, які на той момант прайграваў кандыдату ад партыі рэспубліканцаў, стаць прэзідэнтам. Па-першае, Ніксан быў не ў вельмі добрай фізічнай форме — ён толькі выпісаўся са шпіталю. Акрамя таго, напярэдадні першых дэбатаў палітык, не зразумеўшы важнасці падзеі, рашуча адмовіўся рабіць сабе грым. Адпаведна, выглядаў ён не вельмі прывабна. Нядзіўна, што маці Рычарда пасля першага туру дэбатаў патэлефанавала сыну і спытала, ці не хворы той.

У адрозненні ад суперніка, Кенэдзі на экране быў здаровым і сімпатычным. Асабліва ён спадабаўся жаночай аўдыторыі. Лічыцца, што менавіта іх галасы пазней забяспечылі перамогу. Увогуле, дэбаты ўпершыню даказалі вялікую ролю карцінкі на тэлебачанні. Так, большасць тых, хто глядзеў шоў на экранах, аддалі перавагу Кенэдзі, а тыя, хто сачыў за дэбатамі праз радыё, вырашылі, што перамог на іх Ніксан.

Першы тур дэбатаў стаў пераломным. Кенэдзі вырваўся наперад і змог захаваць перавагу да дня галасавання. Ніксан хутка зразумеў сваю памылку. На другі тур ён з'явіўся ў грыме і выглядаў добра, аднак зламаць тэндэнцыю не здолеў.

Толькі ў 1976 годзе кіраўнікі выбарчых штабоў рэспубліканцаў і дэмакратаў зноў далі згоду на сустрэчу кандыдатаў перад тэлекамерамі. Спрачацца павінны былі дэмакрат Джымі Картэр і рэспубліканец Джэральд Форд. Былі прызначаныя тры раунды.

І сітуацыя 1960 года паўтарылася, аднак яшчэ больш драматычна. На пачатку дэбатаў Форд апярэджваў Картэра. Пасля першага раунду разрыў паміж кандыдатамі яшчэ больш павялічыўся. Аднак у другім раундзе, які быў прысвечаны замежнай палітыцы, Джэральд зрабіў фатальную памылку. Ён сказаў: «Няма ніякага савецкага дамінавання ва Усходняй Еўропе, і яго ніколі не будзе, пакуль будзе адміністрацыя Форда». Відавочная хлусня каштавала яму галасоў. У выніку перамог прадстаўнік партыі аслоў.

Аднак у 1980 годзе Картэр трапіў у тую ж пастку. Ён пагадзіўся дэбатаваць з Рональдам Рэйганам, забыўшыся, што той — акцёр Галівуду. Рэйган згадаў маладосць, цудоўна папазіраваў перад камерай, і калі дэбаты закончыліся, сімпатыі большасці былі на яго баку. Дарэчы, дэбаты паглядзелі 80 мільёнаў чалавек (на той час насельніцтва ЗША складала 226 мільёнаў).

На тых жа выбарах 1980 года ўзнікла праблема трэцяга кандыдата. Як вядома, у штатах двухпартыйная сістэма. Аднак часам нейкаму палітыку ўдаецца скласці канкурэнцыю тандэму. У год Алімпіяды такое і здарылася. Незалежнаму кандыдату Джону Андэрсану, які прадстаўляў фракцыю ліберальных рэспубліканцаў, удалося парушыць манаполію традыцыйных партый. Па выніках апытанняў, яго гатовых былі падтрымаць да 10 працэнтаў выбаршчыкаў. Калі былі абвешчаныя дэбаты, Джон запатрабаваў удзелу ў дуэлі фаварытаў. Публіка была не супраць, аднак у выніку на дэбаты яго не пусцілі.

Затое трэцяга ўдзельніка пусцілі на дэбаты 1992 года, што ў выніку моцна дапамагло Білу Клінтану. Мільярдэр Рос Перо, які быў трэцім кандыдатам, займаў правыя пазіцыі, і падчас размовы галоўным чынам атакаваў Джорджа Буша. У выніку электарат кансерватараў раскалоўся.

Апошнім часам цікавасць да дэбатаў назіраецца ў Старым свеце. Кандыдаты на вядучыя дзяржаўныя пасады спрачаліся ў Германіі, Францыі, Швецыі. У Вялікабрытаніі гэтай вясной дэбаты ўвогуле справакавалі палітычную рэвалюцыю. У бітве партыйных лідэраў нечакана перамог Нік Клег, які прадстаўляў вечна трэцюю партыю ліберал-дэмакратаў. На хвалі ягонага поспеху партыя здолела зрабіць сабе добры імідж, нядрэнна выступіць на выбарах у парламент і ў выніку атрымаць шэраг міністэрстваў у кааліцыйным урадзе.

Што да былога СССР, то як інстытут дэбаты кандыдатаў на тэлебачанні дасюль існуюць хіба толькі ва Украіне. Ідэя іх правядзення ўзнікла ў атмасферы аранжавай рэвалюцыі, калі былі абвешчаны дадатковы трэці тур выбараў. У мінулым годзе кандыдаты таксама сустрэліся ў прамым эфіры. Ёсць надзея, што такія дыскусіі стануць сталай часткай украінскіх выбараў прэзідэнтаў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### НІКАЛЯ САРКАЗІ



Прэзідэнт Францыі не так даўно загадаў дэпартаваць з краіны ўсіх румынскіх цыганоў, нягледзячы на той факт, што Румынія — сябра ЕС. Толькі цыганоў Сарказі аказалася не дастаткова. Цяпер пад каток рэпрэсій трапілі цыганскія цыркі, прынамсі цырк у Парыжы, які існуе 18 гадоў. Перш за ўсё, ад дырэкцыі цырка запатрабавалі звольніць усіх артыстаў з Румыніі, якіх адразу пазбавілі права на працу ў Францыі. Адначасова дырэктара цырку абвінавацілі ў тым, што ён плаціць сваім супрацоўнікам заробак у капэртах. Яшчэ адной падставай для ціску на цырк стала наяўнасць у камандзе артыстаў дзяцей-акрабатаў. Па словах уладаў, гэта не што іншае, як эксплуатацыя дзіцячай працы. У любым выпадку, цыркавыя артысты здавацца не збіраюцца. Яны арганізавалі ў інтэрнэце нешта накшталт збору подпісаў. Ужо 7 тысяч чалавек падпісалі петыцыю, якая вымагае ад Сарказі не толькі пакінуць балканскіх цыган у спакоі, аднак і знайсці для іх працоўныя месцы.

### МІКАЛАЙ АЗАРАЎ



Прэм'ер-міністр Украіны, лідэр Партыі рэгіёнаў у інтэрв'ю выданню «Обозреватель» нечакана зрабіў сенсацыйнае прызнанне. Аказваецца, па яго асабістаму загаду на ўсіх украінскіх тэлевізійных каналах былі зачыненыя сатырычныя праграмы, персанажамі якіх сталі парадзіраваныя вядомыя айчынныя палітыкі. Для гэтага дырэктарам каналаў папросту далі зразумець, што наяўнасць такіх праграм у сетцы перадач будзе каштаваць ім візіту падатковай інспекцыі, праблем з працягам ліцэнзіі на вяшчанне і г.д. Азараў лічыць, што практыка смяяцца з палітыкаў «ненармальная». Так ці інакш, ахвяраў зачысткі сатырычнага поля стала вельмі папулярная праграма «95-ы квартал», якая была адной з візітных картак украінскага тэлебачання. Застаецца дадаць, што сам Азараў неаднаразова быў героем сатырычных скетчаў. Як правіла, гумарысты смяяліся з яго слабага ведання ўкраінскай мовы і кпілі з абсалютнага неведання праблем простых людзей. Аднойчы Азараў, ужо ў рангу міністра, з трыбуны Вярхоўнай Рады параіў украінцам есці больш капусты, якая быццам можа замяніць усе патрэбныя для арганізма прадукты.

### ЮРГЕН ТРЫЦЦІН

Кіраўнік фракцыі нямецкай партыі «Зялёныя» ў Бундэстагу нарабіў розгаласу, калі заявіў, што наступным канцлерам Германіі будзе сябра ягонай партыі. Падставай для такіх амбіцыйных прагнозаў сталі вынікі апытання, апублікаваныя ў салідным тыднёвіку «Stern». Паводле іх, упершыню ў гісторыі рэйтынгі «Зялёных» і сацыял-дэмакратаў зраўняліся. Абедзве партыі падтрымліваюць прыкладна па 24 працэнты нямецкага электарату, прычым тэндэнцыі яўна на карысць «Зялёных». На выбарах мінулага года ў Бундэстаг за экалагаў галасавала 11 працэнтаў, а за эсдэкаў — 28. Вынікі апытання каментуюцца «Зялёнымі» вельмі асцярожна. Яны заўсёды былі малодшымі братамі сацыял-дэмакратаў па кааліцыях, а цяпер аказваецца, што самі мусяць фармаваць павестку дня. Ёсць меркаванне, што «Зялёным» яшчэ рана замахвацца на месца першай партыі ўраду. А вось Трыццін так не думае і заклікае ўжо зараз рыхтавацца да таго, каб кіраваць краінай. Аналітыкі кажуць, што Юрген, які, дарэчы, пачынаў як фанат Мао, мае рацыю. На фоне таго, як Ангела Меркель заклікае працягнуць тэрмін эксплуатацыі АЭС, папулярнасць «Зялёных» будзе толькі расці. І так атрымаецца, што ў адзін цудоўны дзень іншага выбару, як узначаліць кабінет, у іх папросту не будзе.



СПАДЧЫНА

# ШВЕДСКАЯ БЕЛАРУСІСТЫКА

Аляксей ХАДЫКА

**Турысту або падарожніку, які выпраўляецца ў Швецыю, пытанне пра магчымасць убачыць у далёкай Скандынавіі помнікі беларускай культуры можа падацца парадаксальным. Тым не менш нашы краіны звязвала як гісторыя агульнай пануючай дынастыі Вазаў, так і ваенныя супрацьстаянні ў XVII–XVIII стагоддзях. Таму ў Швецыю траплялі як прадметы дыпламатычнага абмену, каштоўныя падарункі, так і ваенныя трафеі, якія захоўваюцца ў шведскіх музеях.**



Замак Скуклостэр 1654–1676 гг.



Партрэт Жыгімонта III Вазы. Школа Рубенса, каля 1624.



Конны даспех Жыгімонта Аўгуста. Кунц Лохнер, Нюрнберг 1550-я.

## Дынастычны звяз

«Прыгажосць на вадзе», як называюць Швецыю, а асабліва Стакгольм, мае дастаткова беларускіх слядоў, якія пакінулі тут складаныя перакрыжаванні гістарычных лёсаў.

Жыгімонт III Ваза, польскі кароль і вялікі літоўскі князь (у 1587–1632), чыя велічная трыумфальная калона ўпрыгожвае пляц перад каралеўскім замкам у Варшаве ў памяць пра перанясенне ім туды польскай сталіцы з Кракава, быў першым прадстаўніком шведскай дынастыі на троне Рэчы Паспалітай. Яго дзед, просты шляхціц Густаў Ваза, ачоліў шведскае вызваленчае паўстанне супраць Даніі (1521–1523) і зрабіўся шведскім каралём, заснаваўшы новую дынастыю. Дынастычны шлюб звязаў яго сына Яна (Юхана) III Вазу з ВКЛ (яго жонкай, а затым маці Жыгімонта III зрабілася Кацярына з Ягайлавічаў, дачка Жыгімонта Старога і Боны Сфорца). Такім чынам, з Беларуссю Жыгімонта III ад нараджэння лучылі сямейныя карані. Але нарадзіўся ён, натуральна, у Швецыі ў 1566 годзе, у замку Грыпсхольм (Gripsholm), дзе яго бацькі знаходзіліся пад хатнім арыштам па загадзе тагачаснага шведскага манарха Эрыка XIV.

Пасля смерці бацькі Жыгімонт III (ужо намеснік польска-літоўскага пасаду з 1587 года) атрымаў спадчынны шведскі трон, і Рэч Паспалітая аказалася звязанай са Швецыяй персанальнай уніяй. Жыгімонт III разам з жонкай Ганнай Аўстрыйскай наведаў Стакгольм, каранаваўся і пакінуў замест сябе рэгентам дзядзьку Карла, герцага Сёдэрманланда. Рэгент пачаў прыбіраць уладу ў Швецыі. І калі Жыгімонт III адмовіўся пасылаць у Швецыю сына Уладзіслава для выхавання ў пратэстанцкім духу, яго дэтранізавалі на гістарычнай радзіме, і ў 1599 годзе Карл Сюдэрманландскі адразу зрабіўся паўнамоцным правіцелем, а з 1604 года — каралём Карлам IX. Так узніклі падставы для працяглай (1600–1629 гады) вайны са Швецыяй, «Першай паўночнай», або «Бітвы за Інфлянты» (Лівонію), якімі ВКЛ валодала з 1560-х. У ёй Жыгімонт III спрабаваў адстойваць свой шведскі пасаг.

## Гісторыя войнаў

Першапачаткова ў вайне шанцавала Рэчы Паспалітай. 405 гадоў таму, 27 верасня 1605 года гетман Ян Караль Хадкевіч разграміў войскі Карла IX пад Рыгай ля мястэчка Кіргольм (Саласпілс). Але з прыходам да ўлады новага караля Швецыі, «льва Поўначы» Густава II Адольфа, сітуацыя змянілася: літоўскае войска ў Лівоніі тройчы цярпела паразы (1617, 1621, 1625). Паляки імкнуліся пераласці цяжар вайны на ВКЛ. А захоп Густавам Адольфам у 1621 годзе Рыгі з вусцем Дзвіны паставіў пад пагрозу ўвесь замежны балтыйскі гандаль ВКЛ. Так узнікла сітуацыя, калі эліта ВКЛ фактычным кансенсусам пачала рыхтаваць сепаратны мір са Швецыяй — пралог будучай Кейданскай уніі 1655 года.

19 студзеня 1627 года ў памежным з Лівоніяй мястэчку Балдэнмойжа беларуская і шведская дэлегацыі падпісалі пагадненне, паводле якога ваенныя дзеянні спыняліся, адбываўся абмен палоннымі (некаторыя не бачылі радзімы па 20 гадоў), а вольны гандаль праз Рыгу аднаўляўся. У гэтым былі зацікаўлены і новыя падданыя Швецыі — рыжскія купцы ды лівонская шляхта. Урэшце мір паміж усёй Рэччу Паспалітай і Швецыяй зафіксавала дамова ў прускім Альтмарку (26 верасня 1629 года): Лівонія падзялілася на шведскія і польска-літоўскія Інфлянты (за ВКЛ да 1721 года засталася каталіцкая Латгалія), а Жыгімонт III адмовіўся ад шведскага трона.

## «Тытанік» XVII стагоддзя

У Першай паўночнай вайне здарыўся і трагікамічны эпізод, дзякуючы якому ў цэнтры Стакгольма зараз існуе ўнікальны музей. У 1625 годзе, марачы пра дамінаванне на Балтыцы і канчатковую перамогу над Рэччу Паспалітай, Густаў Адольф загадаў закласці на стакгольмскіх верфях шэраг караблёў на чале з цудам інжынернай думкі свайго часу флагманам «Ваза». Велізэзнае, названае ў гонар заснавальніка дынастыі Густава Вазы, судна 10 жніўня 1628 года рушыла ў першае падарожжа пад гарматныя салюты ў прысутнасці караля і вялікай колькасці важных гасцей, але праз мілю нахілілася, чэрпаючы ваду праз адчыненыя баявыя люкі, і вокамгненна затанула, пахаваўшы на дне 40 са 150 членаў экіпажу. Карабель даўжынёй 69 метраў і вышынёй ад кіля да верхаліны мачты 52,5 метра, з 64 гарматамі на дзвюх баявых палубах — такіх не было тады ні ў адной краіне свету — загінуў без бою. Катастрофу справавалі няправільная загрузка і памылкі планавання, у якім браў удзел сам кароль. Апошні факт прымусіў замяць расследаванне скандалу.

Падняты ў 1961 годзе, захаваны на 95% адзіны на сёння цэлы карабель XVII стагоддзя, сведка нашай агульнай гісторыі — цяпер самы папулярны музей сталіцы Швецыі. Размешчаны на адной са стакгольмскіх выспаў спецыяльны будынак за гады экспанавання рарытэту наведала 30 мільёнаў турыстаў. Цікава, што «Ваза» з'яўляўся аднachасова ўнікальным агіткараблём: сярод мноства дэкаратыўных скульптур на яго бартах ёсць карыкатурныя постаці каталіцкіх манахаў — выклік лютэранскай Швецыі папскаму Рыму.

## Падарункі і трафеі

Далей у гісторыі беларуска-шведскіх дачыненняў была вайна 1655–1660 гадоў, у якой Швецыя выступіла як апякунка ВКЛ ад маскоўскай навалы, спадзеючыся атрымаць пратэктарат. Губернатар Лівоніі Магнус Дэ ла Гарды выдаў універсал да шляхты ВКЛ: «Кароль польскі Ян Казімір Ваза давёў вашу краіну да руіны і не можа абараніць вас ад Масквы. Мы, шведы, абаронім». Уступленне шведскага войска ў ліпені 1655 года ў беларускае Падзвінне вітала шляхта, асабліва праваслаўная і пратэстанцкая. Перамовы са шведскім дваром вялі стрыечныя браты Януш і Багуслаў Радзівілы, апошні — сваяк шведскага караля Карла X (на троне ў 1654–1660).

На заключэнні дамовы 17 жніўня 1655 года ў Кейданах Радзівілы адстаялі канцэпцыю роўнай уніі са Швецыяй і гарантый усіх правоў грамадзянам ВКЛ розных веравызнанняў, ажыццявіўшы апошнюю спробу самастойнай ад Польшчы знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ. Акт уніі падпісала 1163 шляхціцы ВКЛ. На балі ў Кейданах з нагоды уніі Дэ ла Гарды ўручыў Янушу Радзівілу найвышэйшы шведскі каралеўскі ордэн «Імя Ісуса», залаты з 16 дыяментамі (пасля 1914 года гэты ювелірны шэдэўр пераехаў з Нясвіжскага замка ў экспазіцыю стакгольмскага музея «Каралеўскі цэйхгауз»).

31 снежня 1655 года Януш Радзівіл памёр, атручаны агентамі Яна Казіміра ў Тыкоціне. У 1656 годзе Кейданская унія практычна перастала дзейнічаць, бо ў сталенні да яе беларуская шляхта падзялілася папалам, але да самага замірэння Рэчы Паспалітай са Швецыяй у Аліве ў 1660 годзе факт уніі зберагаў землі ВКЛ ад шведскіх рабункаў, якія практыкаваліся арміяй Карла X у Польшчы.

Не так было падчас Вялікай Паўночнай вайны 1700–1721 гадоў, калі шляхта ВКЛ, падзеленая па прыхільнасцях на прарасійскую і прашведскую партыі, падпала пад рабункі сваіх маёнткаў з супрацьлеглых бакоў. І для Швецыі, і для Расіі ВКЛ зрабілася папросту полем бою і прыладай задавальнення матэрыяльных патрэбаў. Магнус Стэнбок, правая рука шведскага караля, пісаў з Беларусі да жонкі: «Добра нам тут, ад пачатку спімо, ямо і п'ем задарма, а час ад часу і грошы здабываем».

Рабуючы здадзены пад пагрозай знішчэння Нясвіжскі замак (яго уладар Кароль Станіслаў Радзівіл належаў да прарасійскай партыі) фанатычны калекцыянер зброі Карл XII вывез у Стакгольм некалькі радзівілаўскіх гармат. Гэта творы еўрапейскіх і нясвіжскіх людвісараў, у тым ліку немца Германа Мольцфельта, які ліў цяжкую зброю ў нясвіжскай людвісарні пры князі Сіротку ў 1597–1600 гадах. Сёння 21 гармата з ВКЛ зберагаецца ў Вайсковым музеі Швецыі ў Стакгольме (Armemuseum), з іх 9 — нясвіжскія. Роўна столькі ж — 17 медных і 4 жалезныя — не маючы магчымасці забраць з сабой, Карл XII загадаў у Нясвіжы пераплавіць. Тады ж па-варварску былі ўзарваны і замкавыя бастыёны.

## У музейных залах

Вандруючы па ваколіцах Стакгольма, апрача згаданых, варта наведаць іншыя адрасы, сярод якіх пертвораныя ў музеі былыя замкі, дзе зберагаюцца шматлікія трафеі ванных канфліктаў Рэчы Паспалітай і Швецыі. Гэта Каралеўскі палац у Старым горадзе (Gamla stan), а таксама размешчаны ў некалькіх дзясятках кіламетраў ад Стакгольма па дарозе на Упсалу пры возеры Маларен замак Скуклостэр (Skokloster). Замак збудаваны ў 1654–1676 гадах графам Карлам Густафам Урангелем, сынам Германа Урангеля, з якім, рыхтуючы Балдэнмойжскае замірэнне (1627), ліставаўся адзін з уплывовых беларускіх магнатаў смаленскі падваявода Самойла Друцкі-Сакалінскі.

Экспазіцыя замка — выключна трафеі часоў «патопу». Мы прыводзім выяву замка з гравюры 1690-х, выкананай Эрыкам Дальбергам (1625–1703), генерал-губернатарам Лівоніі, аўтарам цікавага дзённіка паходу Карла X на Беларусь. Таго самага афіцэра, які выканаў і шырокавядомую ўнікальную гравюру аблогі Берасця шведскімі войскамі Карла X у 1657-м.

У размешчаным на захад ад Стакгольма Грыпсхольме (Gripsholm), дзе, як памятаем, нарадзіўся Жыгімонт III, іншая беларусістыка: цэлы зал партрэтаў шляхты і вялікіх літоўскіх князёў. Вобраз Жыгімонта III на кані — твор майстэрні Рубенса. Партрэт Яна Казіміра Вазы, які ў выніку міра ў Аліве 1660 года адрокся ад прэтэнзій на шведскі трон, — праца гданьскага мастака Даніеля Шульца (1615–1683). Апошні таксама працаваў для Радзівілаў, Пацаў, Вішнявецкіх.

У каралеўскай збраёўні Стакгольма (Livrustkammaren) можна агледзець унікальны конны даспех Жыгімонта Аўгуста работы нюрнбергскага збраёўніка Кунца Лохнера 1550-х гадоў. А яшчэ ж ёсць лісты беларускіх магнатаў Льва Сапегі, Яна Караля Хадкевіча, Багуслава і Януша Радзівілаў, Казіміра Сапегі шведскім каралям і генералам, дзённік Льва Сапегі 1608–1611 гадоў у Нацыянальным архіве, збор малюнкаў Марка Шагала ў Нацыянальным мастацкім музеі. Ды шмат іншага.

Праз гэтыя рэчы далёкая Швецыя робіцца бліжэй нашаму падарожніку. Можа, звязаныя з Беларуссю скарбы калісьці пашчасціць убачыць на спецыяльнай абменнай выставе і тым беларусам, якія застаюцца на радзіме. А зацікаўленых пазнаёміцца бліжэй з гістарычнай канвой вышэйзгаданых падзей запрашаем прачытаць захапляльную манаграфію шведска-беларускага даследчыка Андрэя Катлярчука «Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў», якая вытрымала пры спрыянні шведскіх спонсараў ужо два выданні ў 2003 і 2007 гадах.

З НАГОДЫ

# «МУЗЫКА БЕЛАРУСКІХ ЗАМКАЎ»

Аляксей ХАДЫКА

**У межах цыкла выданняў «Беларуская музычная калекцыя» выйшаў чарговы дыск — «Музыка беларускіх замкаў». Серыя задумана яе заснавальніцай Арынай Вележ як 12 аб'яднаных агульнай ідэяй музычных альбомаў — лепшае са старадаўняй і сучаснай класічнай і фальклорнай музыкі.**





Арына Вележ-Вячорка


Віктар Скарабагатаў

Распачалася калекцыя з запісаў класікі — з'явіліся «Музыка ВКЛ» у выкананні «Старога Ольсы», аўтэнтычныя фолькавыя «Спевы беларусаў», «Музыка беларускіх храмаў». Чацвёртым стаў дыск «Музыка беларускіх замкаў» — збор твораў кампазітараў XVI–XVII стагоддзяў у выкананні ансамбля «Класік-Авангард». Кампазіцыі старадаўняй свецкай музыкі з рэпертуару канцэртаў на велікакняжацкім і магнацкіх дварах таго часу, сабраныя разам і выкананыя выключна «Класік-Авангардам», выпускаюцца ўпершыню. Раней працы ансамбля запісваліся на дысках паасобку ў розных зборках за мяжой і ў Беларусі.

Вартасць выканальніцкага майстэрства «Класік-Авангарда» — у аднаўленні аўтэнтычнага стылю далёкай эпохі і ў якасці аранжыровак. Кіраўнік ансамбля Уладзімір Байдаў — унікальны спецыяліст, лепшы ў Беларусі даследчык-аранжыроўшчык музычнай спадчыны. Аднаўленне твораў па некалькіх радках нотнага запісу, зробленага 300–400 гадоў, таму патрабуе вялікага майстэрства і адчування стылю эпохі.

Да нашага часу дайшлі табулатуры лютністаў і арганістаў, табулатуры клавірнага тыпу, творы з якіх выконваліся на клавесінах альбо невялікіх пазітывах, інструментах, якія стаялі ў залах палацаў і замкаў. Кампазітары, прадстаўленыя на дыску сваімі творами, былі майстрамі высокай кваліфікацыі, з еўрапейскім досведам, нярэдка замежнай адукацыяй. Іх мелодыі гучалі і ў выкананні капэлаў, якія дзейнічалі ў сталічнай Вільні, Гародні, Нясвіжы.

***— Як нарадзіўся праект? — цікавімся мы ў яго кіраўніка Арыны Вележ.***

— Усё пачалося з выдання двух альбомаў «Легенды Вялікага Княства», якое запаволілася з-за праблемы набыць аўтэнтычныя інструменты таго часу дзеля рэканструкцыі музыкі Рэнесансу і барока. Папулярная ў Еўропе плынь рэканструкцыйнага выканання гістарычных твораў у Беларусі адсутнічае: няма сродкаў, спонсараў, дзяржаўнага фінансавання. І нават адпаведных ставак для прафесуры ў Акадэміі музыкі. Спадзявацца на прафесійную працу ў такіх умовах цяжка, таму на запісах «Легенд Вялікага Княства» ляжала пячатка аматарства. Тады і ўзнікла ідэя «Беларускай музычнай калекцыі», стварэння прафесійных запісаў класічных твораў беларускай музыкі. Яна прадугледжвае выпуск 16 дыскаў, паставіўшы якія на паліцу, мы атрымаем музычную карту ВКЛ у прасторы і часе. Першыя дыскі серыі ахапілі пласт музычнай культуры да XIX стагоддзя. У XIX стагоддзі я маю намер засяродзіцца не на Станіславе Манюшку і Міхале Клеафасе Агінскім, якія добра вядомыя слухачам, а высунуць наперад свае аўтарскія прыярытэты. Прадставіць музычную творчасць Напалеона Орды і іншых малавядомых аўтараў, спадчыну якіх варта данесці да сённяшняга маладога пакалення. Таму выпуск дыскаў мяркуецца ў даступнай пакупніку цэнавай катэгорыі, а продаж — праз музеі, музычныя імпрэзы і папулярныя кіёскі.

***— Вы нейкім чынам перахопліваеце ініцыятыву Акадэміі музыкі?***

— На жаль, пасля звальнення з Акадэміі музыкі Віктара Скарабагатава, пра яе ролю ў аднаўленні спадчыны беларускай класікі даводзіцца казаць са скепсісам. Склалася сітуацыя, калі спецыялісту ў музычнай беларусістыцы Вользе Дадзіёмавай стала цяжэй фармаваць выкладчыцкую праграму, а прафесуры, якая аддана займаліся прапагандай беларускай музычнай культуры, не давалася прыярытэтаў. Выдзяленне выканаўцам-лаўрэатам стыпендый, дадатковага фінансавання не спрыяе захаванню нацыянальнай спадчыны, развіццю адметнай музычнай школы. Дасягненні высокага выканальніцкага майстэрства для гэтага не дастаткова. Таму, маючы за плячыма толькі музычную школу, я вымушана займацца тым, што варта было б рабіць акадэміі.

Хвалюе адсутнасць праграмы па выданні помнікаў музычнай культуры, якую варта мець на міністэрскім узроўні. Не існуе і адэкватнай сістэмы ўзнагароджання спецыялістаў-падзвіжнікаў у гэтай сферы. Ці не парадокс, што за аднаўленне на нацыянальнай сцэне оперы Яна Голанда «Чужое багацце» (1785 г.), адзначанае Дзяржаўнай прэміяй, аўтар яе сучаснай транскрыпцыі Уладзімір Байдаў не атрымаў нават звання заслужанага артыста?

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «ДЗІЦЯЧЫ АЛЬБОМ»

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**На сядзібе Таварыства беларускай мовы адбылася імправізаваная прэзентацыя «Дзіцячага альбому», над якім працавалі вядомыя выканаўцы Зміцер Сідаровіч (ех-«Камэлот») і Таццяна Грыневіч-Матафонава.**






Таццяна Грыневіч-Матафонава і Зміцер Сідаровіч з сынамі

Іх памочнікамі і паўнапраўнымі ўдзельнікамі прэзентацыі сталі Адась Матафонаў і Тамаш Сідаровіч — сыны Змітра і Таццяны, якім, адпаведна, 9 і 12 гадоў. Менавіта іх звонкія галасы ўпрыгожылі міні-канцэрт паводле «Дзіцячага альбому» і саму праграму новай кружэлкі.

Дзякуючы творчаму супрацоўніцтву з салісткай Белдзяржфілармоніі Таццянай Грыневіч-Матафонавай пабачыў свет гэты незвычайны дыск. На «Дзіцячым альбоме» Таццяна выступіла ў некалькіх важных іпастасях: як аранжыроўшчык і як музыкант — у якасці скрыпачкі, флейтысткі, выканаўцы на акарыне, піяністкі. Зміцер жа, акрамя традыцыйнай гітары і дуды, на дыску займаўся аранжыроўкамі песень, спяваў, граў на іншых інструментах. Але галоўнае музычнае перадвызначэнне Таццяны, як, зрэшты, і Змітра, — выхаванне беларускага музычнага густу сваіх дзяцей.

У «Дзіцячым альбоме» — 27 трэкаў, на якіх гучаць творы, запісаныя і выдадзеныя айчыннымі фалькларыстамі ў серыі «Беларуская народная творчасць». Адабраныя гэтыя песні такім чынам, каб альбом і творы з яго можна было выкарыстоўваць для сямейнага праслухоўвання, развучвання ў хоры ці сольна ў выглядзе інсцэніровак, выкарыстоўваць яго матэрыял для дзіцячых дыскатэк. Для гэтага, дарэчы, на дыску маецца файлы з нотамі песень з «Дзіцячага альбома». Мо таму ініцыятары і выдаўцы гэтай музычнай працы паставілі сабе на мэту прапанаваць музычны матэрыял дыска Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці метадычнага зборніка для выкарыстання ў пазакласнай школьнай працы.

Гісторыя стварэння гэтага музычнага сшытка мае вялікі тэрмін — амаль некалькі гадоў, на працягу якіх у бацькоў беларускамоўнай групы сталічнага дзіцячага садка № 314 выкрышталізавалася ідэя стварэння складанкі народных дзіцячых песень, якія б змаглі абудзіць цікаўнасць дзетак да фальклору, да спеваў, да беларушчыны. Тады не было жадання запісаць гэтыя творы на дыск, а паўставала імкненне «зрабіць нешта на трывалай беларускай глебе», каб нашы дзеці ведалі не толькі мелодыі савецкіх «мульцікаў», але і цудоўныя мелодыі і дасціпную народную паэзію беларускага фальклору. Ідэя запісу нарадзілася праз два гады. І вось яна рэалізавалася ў дыску, які просіцца мець працяг.

Па словах Змітра і Таццяны, аранжыроўкі песень «Дзіцячага альбому» можна падзяліць на два ўмоўных падыходы: выкананне песень у народных, вясковых традыцыях, да якіх пасуе скрыпка, дуда, акарына, і архаічныя спевы з выкарыстаннем урбанізаваных аранжыровак пад гітару, з дапамогай кампутарных тэхналогій.

Трэба адзначыць, што галоўнымі дзеючымі асобамі прэзентацыі сталі Адась Матафонаў і Тамаш Сідаровіч, чыімі галасамі загучалі такія цудоўныя песні, як «Кую-кую ножку», «Чыкічыкі, сарока», «Тын-тын», «Тулю-лю», «Ішоў казёл мастом», «Каза-Таўкачыкі». Як паведаміў Зміцер Сідаровіч, з канцэртнай праграмай паводле «Дзіцячага альбома» юныя музыканаты ўжо аб'ехалі амаль усю Беларусь, песні з яго спявалі ў розных рэгіёнах краіны і паўсюль мелі вялікі поспех і захапленне гэтымі звонку простымі, але старажытнымі мелодыямі. Часцяком юныя артысты і іх бацькі мелі выступы ў сталічных кафэ «Жар-птушка», у якім штотыдня адбываюцца этнічныя танцавальныя вечары, ладзяцца вечарыны фальклорнай музыкі. Пра ўсё гэта, а таксама пра тое, як працавалася Адасю і Тамашу ў студыі, распавялі самі юныя спевакі, калі высветлілася, што хлопцы маюць што сказаць журналістам і проста цікаўным аматарам беларускага фальклору.

Стваральнікі і выдаўцы «Дзіцячага альбому» выказалі асаблівую ўдзячнасць дзеячам беларускай эміграцыі ў ЗША, у прыватнасці, спадарыні Ірэне Калядзе-Смірновай, а таксама фундарам з Культурна-адукацыйнай фундацыі Орса-Рамана, без фінансавай падтрымкі якіх праект «Дзіцячага альбома» не быў бы рэалізаваны. А яшчэ ўсе прысутныя на прэзентацыі «Дзіцячага альбому» былі заінтрыгаваныя паведамленнем Змітра Сідаровіча і Таццяны Грыневіч-Матафонавай пра тое, што будзе працяг гэтай працы — другая частка альбома, якую музыканты плануюць выдаць на Каляды.

▸ ЧЭМПІЯНАТ

# НЕАПАЗНАНЫЯ ЛЯТАЮЧЫЯ БУТЭЛЬКІ

Алеся СЕРАДА

**Патрапіўшы на спаборніцтвы барменаў, адчуваеш сябе нібыта ў цырку — прычым не на далёкай трыбуне, а папросту на арэне.**




Фаварыты апантана жанглююць бутэлькамі, нібы клоуны-майстры булавамі, не забываючыся пра чыста практычную задачу: каб напрыканцы выступу ў гэтых самых бутэльках хоць нешта засталося. Гэтую рэшту бармен эфектна пералівае ў шклянку для кактэйлю, і алкагольны градус атрыманага напою — таксама адзін з пунктаў, паводле якіх журы ацэніць яго выступ.

Чарговы адборачны тур рэспубліканскага конкурсу «Flair Open Minsk 2010», які прайшоў 21 верасня ў сталічным бары «Barberry», быў эфектным і сапраўды паказальным у тым, што датычыцца майстэрства, спрыту і артыстызму. У параўнанні з мінулагоднімі гульнямі барменаў адчувалася, што, па-першае, удзельнікі сапраўды патрацілі шмат часу на падрыхтоўку выступленняў, а, па-другое, узмацніліся і камандны дух (ва ўсялякім разе, на ўзроўні гарадоў ды клубаў), і імпэт балельшчыкаў.

Як заўважыў Сяргей Хораў, прафесійны вядучы спаборніцтваў барменаў з Украіны: «Некаторыя з нас сустракаюцца толькі на падобных мерапрыемствах...» І гэта нягледзячы на тое, што спонсараў, у параўнанні з 2009 годам, трохі паменела, таму і набор кактэйляў, якія трэба было зрабіць, быў даволі лаканічным: гарэлка з энергетычным напоем ды гарэлка з тонікам. Аднак, як аказалася, нават з гэтымі нескладанымі інградыентамі не ўсё так проста!

«Флэйрынг» — так правільна называецца майстэрства эфектна разліваць напоі — гэта сапраўдны спорт, дзе перамагае мацнейшы, самы мэтанакіраваны ды засяроджаны. З іншага боку, гэта — мастацтва, блізкае да эстраднага: нават выбар музыкі, пад якую выконваюцца паказальныя выступленні, значыць не менш, чым, напрыклад, у фігурным катанні.

Вялікую ролю адыгрывае і артыстызм: гледачы грамчэй апладзіруюць нават не таму бармену, чыя каардынацыя была больш дасканалай, а таму, хто здолее «падпаліць» публіку ўласнымі эмоцыямі. Выпусціў шэйкер? Разбіў бутэльку? Пасміхайся і не бойся прызнаць уласную прамашку! Каб уразіць гледачоў, у цябе ёсць лічаныя хвіліны і вычарпальны набор рознакаляровых вадкасцяў.

І не трэба нават казаць, колькі бутэлек грукнулася аб падлогу бара ў тую ноч — гледачы, што стаялі бліжэй да сцэны, сапраўды рызыкавалі, па меншай меры, пакінуць бар з гузам на лбе. Тое самае можна сказаць і пра фатографаў, якім таксама было нялёгка: ім забаранілі карыстацца ўспышкай, і, каб атрымаць добрыя здымкі, фотакоры ледзьве не падкідвалі свае апараты не горш за саміх канкурсантаў...

Абавязковая праграма складалася з трох частак. Спачатку кожны з барменаў дэманстраваў класічны, або працоўны флэйрынг — у гэтым выпадку бутэлькі з напоямі павінны быць напоўненыя не менш чым на трацiну, а атрыманы кактэйль мусіць хоць бы прыблізна адпавядаць стандартнай рэцэптуры. Потым «фрыстайл», або шоу-флэйрынг: галоўнае — эфектныя трукі, сярод якіх — нязменна жангліраванне трыма або нават чатырма бутэлькамі.

Гэтая частка была найскладанейшай: нават такія трэніраваныя шоумэны, як Альгімантас (Альгіс) Пракаповіч або яго калега Раман Мамаеў, не былі застрахаваныя ад памылак. І ўрэшце, тыя, хто прайшоў адбор, дэманструюць «баланс» — падкінуўшы бутэльку, злавіць яе ды ўтрымаць у раўнавазе на працягнутай руцэ, галаве або нават назе. У выніку, паводле ўсіх трох іспытаў, першае месца заняў Альгіс — і гэта далёка не першая яго перамога: у мінулым годзе ён заняў першае месца ў фінале «Flair Open», зрабіўшыся, такім чынам, абсалютным пераможцам за 2009 год. Цікава, ці ўтрымае ён першынство ў гэтым годзе?

Вядома, фармат клубнага мерапрыемства, ды яшчэ на алкагольную тэматыку, — гэта не зусім тое, што мы разумеем пад культурным жыццём, ды і наўрад ці вам пашанцуе сустрэць прафесіянала флэйрынгу недзе, акрамя як у дарагім ды прэтэнцыёзным бары. Не раз гучаў са сцэны і напамін пра тое, што алкагалізм — адна з прафесійных барменскіх хваробаў.

Аднак калі ўсё-ткі выпіваць — то лепей рабіць гэта з шыкам і гумарам, ды з іскрамётным шоу на закусь. Прынамсі, большасць гасцей мерапрыемства разумела тое вельмі добра — дарэчы, гэта збольшага былі людзі, таксама занятыя ў барнай справе. Гэта было іх прафесійнае свята — і, каб развеяцца перад доўгімі працоўнымі начамі, яны актыўна суперажывалі канкурсантам ды шчыра пасмейваліся з камічных сцэнаў.

Адзін з барменаў-канкурсантаў забаўляў публіку, пазіруючы перад фотаздымачом з ажно двума таўшчэзнымі цыгарамі ў роце, быццам у песні «Ляпіса Трубяцкога». Іншы — не будзем называць яго імя — толькі выйшаўшы на сцэну, даведаўся, што на ім павінна быць рэкламная майка з лагатыпамі спонсараў, і без вялікай сарамяжлівасці пераапрануўся, паказаўшы люду свой не надта загарэлы торс.

Было з чаго пасмяяцца, аднак галоўнае — было і чаму падзівіцца: як звычайная працэдура пералівання гарэлкі з бутэлькі ў шклянку ператвараецца ў неверагоднае відовішча, што дэманструе вялікую волю ды нечалавечы спрыт.

▸ АФІША

# ШЭДЭЎРЫ ІСПАНСКАГА КІНО

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Пасля кароткага фэсту ізраільскага кіно, паказанага ў сталіцы, надышла чарга кіно іспанскага.**

У мінскім пракаце будзе прадстаўлена праграма рэдкай іспанскай класікі. Спіс заканамерна ўзначальвае Луіс Бунюэль — кінасюррэаліст і майстар зграбных гратэскаў, які працягвае традыцыі Гоі.

На экране — прыпавесць «Анёл-знішчальнік» 1966 года, знятая рэжысёрам у Мексіцы. Пасля званай вячэры важныя госці ніяк не могуць пакінуць пакой. Яны каторы дзень знаходзяцца ў адной залі — і не здольныя пераступіць парог. Уплыў карціны магічны. Аўтар гэтых радкоў быў сведкам, як сучасныя гледачы пасля прагляду баяліся выйсці з кінатэатру.

У карціне «Вірыдыяна» 1961 года Бунюэль сутыкае гераіню, якая спрабуе жыць па хрысціянскіх запаветах ды стаць манашкай, з рэаліямі правінцыйна-дыктатарскага жыцця. Вірыдыяна наведвае свайго дзядзю — крывадушнага і вычварнага чалавека, што робіцца пачаткам канца яе веры.

Дзве стужкі ў праграме належаць іншаму іспанскаму класіку — Карласу Сауры. У драме «Паляванне» 1966 года Саура даследуе знявечаную грамадзянскай вайной свядомасць. Тры ветэраны адпраўляюцца паляваць на трусоў, але палююць адзін на аднаго. «Эліза, жыццё маё» 1977 года з Джэральдзін Чаплін — сямейная драма пра сумленне і праўду.

«Смерць веласіпедыста» 1955 года Хуана Антоніа Бардэма і «Дух вулея» 1973 года Віктара Эрысэ ўпрыгожваюць іспанскі фэст. У карціне Бардэма багатая дама збівае чалавека — і хаваецца з месца злачынства. Але сумленне не дае ёй спакою. А ў карціне Віктара Эрысэ маленькая дзяўчынка, зачараваная старой стужкай «Франкенштэйн», знаходзіць уцеклага жаўнера-рэспубліканца. Фільм Эрысэ лічыцца адной з сама паэтычных стужак страшнага кіно, метафарай самой дзесятай музы.

Фільмы здымаліся ў аўтарытарныя часы, так што карціны будуць блізкія сённяшняму беларускаму гледачу.

Адбудуцца яшчэ наступныя паказы:

Да 3 кастрычніка ў «Цэнтры-Відэа» фільм «Паляванне».

4–10 кастрычніка ў «Цэнтры-Відэа» фільм «Дух вулея».

«Смерць веласіпедыста» — 6 кастрычніка ў кінатэатры «Перамога», 11–17 кастрычніка — у «Цэнтры-Відэа».

«Вірыдыяна» — 13 кастрычніка ў «Перамозе», 18–24 кастрычніка — у «Цэнтры-Відэа».

«Эліза — жыццё маё» — 20 кастрычніка «Перамога», 25–31 кастрычніка «Цэнтр-Відэа».




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП "Плутас-Маркет". г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 970

Падпісана да друку 1.10.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.